ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 САКАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 41 (28151) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ровары «з душой»

Папулярная навука па-беларуску

Журналістыка — гэта лад жыцця

СТАР. 5

ВЯЛІКІ КВЕТКАВЫ СЕЗОН

Прынамсі ён ужо пачаўся ў сталічным прадпрыемстве «Мінскі парнікова-цяплічны камбінат». Да 8 Сакавіка тут ужо вырашчана больш за 50 тысяч руж і 80 тысяч цюльпанаў. Кветкаводы Кацярына САВІНА, Ірына КІРЫКОВІЧ, Настасся МОЛЧАН працуюць сярод гэтага хараства штодня.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Беларуская сельскагаспадарчая прадукцыя сёння пастаўляецца на рынкі больш як 30 краін. Асноўная маса яе — больш за 80 працэнтаў — рэалізуецца на рынкі Расіі. Так, гэты рынак для нас сёння больш прэміяльны, чым іншыя. Але пастаўлена задача прырост прадукцыі пастаўляць на рынкі трэціх краін. Цяпер многія прадпрыемствы могуць пастаўляць прадукцыю ў Кітай, ідзе работа на рынках Інданезіі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.03.2016 г.

Долар ЗША	21275,00	▼
Еўра	23094,00	▼
Рас. руб.	288,85	▲
Укр. грыўня	796,82	▲

9 771990 763008 16041

■ Спажывецкі кошык

КАМУ СЫР З ЦВІЛЛЮ,

або Будзе попыт — зробім і хамон

Я з таго пакалення, якое заспела часы дэфіцыту. Памятаю, як людзі хадзілі ў крамы са слоікам, каб купіць смятану на вагу, як стаялі ў чэргах па каўбасу, цукар ці нават малако і хлеб; як радаваліся, калі на прадпрыемствах выдавалі наборы дэфіцытных прадуктаў, і як штурмаваліся крамы, дзе на прылаўках з'яўляліся зялёныя бананы. А сёння мы маем настолькі насычаны рынак, што даводзіцца шмат часу змарнаваць, каб навучыцца ў ім арыентавацца. Ці ўмеем мы прадумваць свой рацыён, выбіраць якасныя прадукты? Ці ведаем, як выкарыстоўваць ці падаваць на стол нетрадыцыйныя для нашай краіны прадукты? Ці чытаем этыкеткі і ўмеем расшыфроўваць на іх надпісы?

ТАННЫЯ — ЗНАЧЫЦЬ МЕНШ КАРЫСНЫЯ?

Сёння ў якасці эксперта, які можа даць нам карысныя парады па выбары прадуктаў, без якіх наўрад ці абыходзіцца якая сям'я беларусаў, мы запрасілі **дырэктара Інстытута мяса-малочнай прамысловасці Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Аляксея МЕЛЯШЧЭНЮ**. У час гутаркі высветлілася, што нашых спажыўцоў сапраўды трэба выхоўваць, бо ад іх выбару залежыць, што будзе трапляць у гандлёвую сетку.

Беларусы спажываюць за год 80 кг на чалавека мясных вырабаў і ў межах 260-280 кг малака і малочных прадуктаў. І айчынныя вытворцы гатовы выпускаць для іх любую прадукцыю. Можа, пакуль на нашым рынку і нельга знайсці, напрыклад, хамон, папулярны ў Іспаніі. Але нашы заводы маглі б і яго вырабляць, калі б на такі прадукт — даволі дарагі і нязвыклы для беларусаў — знайшоўся спажывец.

СТАР. 4

■ Нерухомасць

РЭАЛЬНЫ ПОПЫТ — ТОЛЬКІ НА НОВЫЯ КВАТЭРЫ

Цяпер у гатовых новабудоўлях упершыню прапануецца беспрацэнтная растэрміноўка на два гады. Прынамсі на дарагія кватэры

Сёлета пакупніцкая актыўнасць на першасным рынку жылля пачала аднаўляцца ўжо ў другой палове студзеня, пасля чаго кліенты і арганізатары будаўніцтва стварылі сапраўдны рывок: колькасць здзелак за першы месяц удвая перавысіла падобны паказчык за студзень 2015-га. Аднак на другасным рынку попыт знізіўся амаль да нуля.

Кошт «квадрата» ў новабудоўлях дасягнуў мяжы ў 800 долараў

Намеснік начальніка аддзела кансалдынга і аналітыкі аднаго са сталічных агенцтваў нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ адзначае, што пачатак года для рынку нерухомасці заўсёды з'яўляецца няпростым часам, асабліва студзень. Ужо традыцыйнае скаканне валют прымушае пакупнікоў браць «тайм-аўт» каб звыкнуцца з «новымі» коштамі. Гэта прымушае забудоўшчыкаў і прадаўцоў шукаць новыя маркетынгавыя магчымасці прыцягнення пакупнікоў з найменшымі зніжэннямі кватэрных каціровак. Як вынік, сёлета на рынку новага гатовага жылля з'явілася беспрацэнтная растэрміноўка на два гады на кватэры вялікіх плошчаў.

СТАР. 2

■ Парламенцкі дзённік

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«ПЕРЫЯД УЗАЕМНАГА НЕДАВЕРУ АДЫХОДЗІЦЬ У МІНУЛАЕ»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з паслом Германіі

Наша дзяржава заўсёды аддавала прыярытэт супрацоўніцтву з Германіяй — калі казаць пра еўрапейскі рэгіён. На гэта звярнуў увагу старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка падчас размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Германіі ў нашай краіне Петэрам Дэтмарам.

Фота БЕЛТА.

— Нашы стасункі з Германіяй вельмі дынамічна развіваліся ў 1990-х гадах, — узгадаў Уладзімір Андрэйчанка на пачатку сустрэчы. — У нас былі вельмі частыя паездкі ў Германію: праводзіліся выставы, кірмашы, канферэнцыі. На жаль, быў спад у гэтых адносінах. Сёння мы хочам адзначыць, што перыяд нейкага ўзаемнага недаверу ўсё ж адыходзіць у мінулае. Гэта, натуральна, радуе.

Па словах спікера, у Беларусі і Германіі цяпер ёсць новыя магчымасці для актывізацыі супрацоўніцтва.

— Менавіта Берлін фактычна ўзяў на сябе ролю лакаматыва ў пытанні адмены Еўрасаюзам санкцый у дачыненні да Беларусі, — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Мы ўдзячны вашай краіне, яе кіраўніцтву за тую канструктыўную, паслядоўную пазіцыю, якую яна заняла ў гэтым пытанні.

Уладзімір Андрэйчанка бачыць добрыя перспектывы для супрацоўніцтва, абмену вопытам у такіх кірунках, як мясцовае самакіраванне, якое вельмі добра развіта ў Германіі; абмеркаванне актуальных пытанняў міжнароднага парадку дня, узаемадзеянне паміж міністэрствамі і ведамствамі.

Што да гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, то па выніках мінулага года таварааварот склаў амаль 2,5 мільярда долараў. У той жа час спікер звярнуў увагу, што ў 2013 годзе гэтая лічба складала 4,8 мільярда.

— Працаваць ёсць над чым у гэтым плане, — упэўнены старшыня Палаты прадстаўнікоў.

У той жа час у нашай краіне сёння працуе 361 прадпрыемства з германскімі інвестыцыямі.

— Мы зацікаўлены, каб германскія інвестары прыходзілі ў тыя галіны, у якіх яны ўжо заслужылі прызнанне ў свеце. Асабліва ў такія сферы, як машынабудаванне, хімія, нафтахімія, энергетыка, сфера высокіх тэхналогій... Натуральна, нам трэба больш наладжваць супрацоўніцтва і ў гуманітарнай сферы, сферах адукацыі, культуры, у развіцці адносін паміж нашымі гарадамі-пабрацімамі — наколькі мне вядома, у нас цяпер 20 пар такіх пабрацімскіх гарадоў.

Пасол Германіі Петэр Дэтмар пагадзіўся, што патэнцыял у сферы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва выкарыстоўваецца не да канца. Тут ён мае досвед: нямецкі дыпламат працаваў у нашай краіне з 2009 па 2013 год у якасці саветніка-пасланніка, намесніка кіраўніка Пасольства Германіі ў Мінску. У верасні мінулага года пачалася яго ўласная дыпламатычная місія ў нашай дзяржаве.

— Мы знаходзімся на новым этапе двухбаковых адносін, — заявіў ён. — Натуральна, мы пачынаем не з нуля, паколькі на працягу 25 гадоў развівалася актыўнае супрацоўніцтва ў галіне культуры, эканомікі, а гэта з'яўляецца добрай асновай для развіцця патэнцыялу.

На думку нямецкага дыпламата, сёння актуальна паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва, якое, на яго думку, можа мець розныя формы.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

ВЫНІК — ПРАЗ ПРАЦУ

Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам працоўных калектываў

«Сёння па даручэнні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ўручаны заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў нашай краіны. Адзначу, што імі вы ўдастоены за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў», — сказаў Андрэй Кабякоў, звяртаючыся да прысутных.

Прэм'ер-міністр канстатаваў, што 2015 год быў нялёгкім, але пры гэтым удалося дабіцца пэўных вынікаў. У прыватнасці, збалансаваны знешні гандаль, палепшаны плацежны баланс краіны. Паводле яго слоў, жорсткая манетарная палітыка, гнуткае курсаўтварэнне, кантроль над грашовым прапанаваннем далі магчымасць утрымаць інфляцыю ў запланаваных межах — рост цэн склаў 12 працэнтаў (мінімальнае значэнне за апошнія 5 гадоў). Пры гэтым забяспечана стабільнасць на спажывецкім рынку.

«У прыярытэтах — рост і дыверсіфікацыя экспарту. Гэта прадугледжана Указам №78 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь», які кіраўнік дзяржавы падпісаў 23 лютага. У дакументе выкладзены сістэмныя меры, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці функцыянавання эканомікі за кошт забеспячэння належнай якасці кіравання дзяржаўнымі прадпрыемствамі і зніжэння сабекошту прадукцыі, развіцця добрасумленнай канкурэнцыі на ўнутраным рынку, рацыянальнага імпартазамяшчэння», — сказаў кіраўнік беларускага ўрада. Паводле яго слоў, прадугледжваецца паскоранае развіццё малога і сярэдняга бізнесу, прыцягненне замежнага капіталу ў развіццё і стварэнне вытворчасцяў, паступальнае зніжэнне ставак па крэдытах у эканоміцы.

Усяго дзяржаўныя ўзнагароды з рук кіраўніка беларускага ўрада атрымала каля 90 чалавек, паведамляе БЕЛТА. Сярод іх — супрацоўнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, медыцынскія работнікі, настаўнікі, выкладчыкі, вучоныя, кіраўнікі спецыялізаваных дзіцяча-юнацкіх школ алімпійскага рэзерву.

РЭАЛЬНЫ ПОПЫТ — ТОЛЬКІ НА НОВЫЯ КВАТЭРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Эксперты нагадваюць, што і цяпер на першасным рынку жылля самым шматлікім з'яўляецца клас «Стандарт» — яго доля складае каля 53% ад агульнага аб'ёму новабудоўляў. Таму менавіта гэты клас можна разглядаць як свайго роду індыкатар цэнаўтварэння на рынку. Што мы тут маем? У параўнанні са снежнем 2015-га зніжэнне сярэдняй цаны на новабудоўлі гэтага класа сёлета ў студзені склала 4% (мінус 50 долараў за квадратны метр) і апошняя дасягнула ўзроўню 1 190 долараў за «квадрат». У залежнасці ад колькасці пакояў сярэдні кошт квадратнага метра гэтага класа складае 1 275 долараў за квадратны метр для аднапакаёвых, 1 215 долараў — для двухпакаёвых і 1 160 долараў — для трохпакаёвых кватэр.

Цэннік арэнды сфарміраваўся на ўзроўні 205 долараў для аднапакаёвых, 270 долараў для двухпакаёвых і 335 долараў у месяц для трохпакаёвых кватэр.

Зніжэнне цэн зафіксавана таксама і па класах «Эканом» і «Камфорт». Такім чынам, бюджэтны клас патанней прыкладна на 3% да ўзроўню 1 080 долараў за квадратны метр, а больш дарагі «Камфорт» атрымаў мінус 4% — 1 330 долараў за квадрат. У той жа час кошт кватэр найвышэйшага на рынку новабудоўляў Мінска класа «Прэстыж» нават прыплюсаваў на 2%. Прычынай такога павышэння з'яўляецца заканчэнне навагодніх акцый і абмежаванне сапраўды элітнай прапановы. У выніку сярэдняя цана квадрата ў новабудоўлях класа «Прэстыж» склала 1 805 долараў.

СЯРЭДНІЯ ЦЭНЫ, ПРАПАНОВЫ
(долараў за квадратны метр)

	Адна-пакаёвыя	Двух-пакаёвыя	Трох-пакаёвыя
Эканом 1 *	1 085	1 080	1 010
Стандарт 2 *	1 275	1 215	1 160
Камфорт 3 *	1 420	1 310	1 350
Прэстыж 4 *	1 920	1 805	1 910

Калі разглядаць усе варыянты прапановы, то мінімальны кошт квадратнага метра жылля новабудоўляў на этапе катлавана ў студзені склаў 799 долараў. Гэты цэннік сфарміраваны для кватэр першых паверхаў, якія здадуцца ў эксплуатацыю нават без чарнавога адстройвання, г.зн. без сцяжкі і тынкоўкі на сценах. На этапе здачы дома ў эксплуатацыю мінімальныя цэны на новае жыллё складаюць у межах 915 долараў за квадратны метр для трохпакаёвых кватэр і 964 долараў за «квадрат» для адна- і двухпакаёвых кватэр.

Пры рэальных здзелках — мінус 6%

Падобныя тэндэнцыі цяпер назіраюцца і на другасным рынку жылля. Паводле падлікаў экспертаў, па выніках першых месяцаў года цэны на гатовае жыллё ў Мінску знізіліся да ўзроўню 2006 года.

І тут у першую палову студзеня рынак жылля практычна стаяў. Скачок курсаў валют зноў прыпыніў здзяйсненне здзелак. Аднак у другой палове месяца рынак ажыў. Пакупнікі і прадаўцы зразумелі, што эканамічная сітуацыя ў найбліжэйшы час не зменіцца, і вырашаць сваё жыллёвае пытанне неабходна «тут і цяпер», з улікам існуючай сітуацыі. У параўнанні са снежнем 2015 г. за студзень і першую палову лютага 2016 г. кошты прапановы знізіліся ў сярэднім на 3%, а цэны рэальных здзелак — на 6%. Сярэдні кошт кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў па выніках другой дэкады лютага можна разлічваць, зыходзячы з цаны квадратнага метра за 1 140 долараў для аднапакаёвых, 1 070 долараў для двухпакаёвых і 1 010 долараў для трохпакаёвых кватэр.

Падобны ўзровень цэн здзелак адпавядае ўзроўню 10-гадовай даўнасці, а менавіта другога квартала 2006 года. Такія ж цэны прапановы апошні раз назіраліся ў крызісных 2009 і 2011 гадах.

Разам са зніжэннем цэн колькасць прапанаваных у продаж кватэр на рынку працягвае павялічвацца. З пачатку года аб'ём прапановы вырас на 15%. Адной з прычын росту з'яўляецца істотнае зніжэнне колькасці здзелак. У параўнанні з сярэднім паказчыкам 2015-га колькасць зарэгістраваных пераходаў правоў уласнасці сёлета ў студзені знізілася больш як на 40%.

Пятая частка пакупнікоў — з рэгіёнаў

Наш эксперт упэўнены, што цяпер прадаўцам ва ўмовах амаль максімальнай прапановы і ў рэжыме зніжэння цэн важна мінімізаваць час продажу кватэры. Справа ў тым, што кожны месяц пошуку пакупніка не прыбаўляе кватэры кошту, а наадварот — зніжае яго. З прычыны чаго ў першую чаргу неабходна першапачаткова аб'ектыўна вызначаць цану кватэры, бо менавіта яна наўпрост уплывае на тэрмін продажу. Менавіта таму пры «падзенні» рынку прадаўцы павінны ісці на апярэджанне і прапаноўваць кватэры сёння па заўтрашніх крыху ніжэйшых цэнах. У адваротным выпадку (за кошт павелічэння часу продажу і таму далейшага зніжэння цэн) фінансавыя страты могуць быць больш значнымі.

Цяпер сярэдні працэнт велічыні дэльты гандлю па здзелках, якія адбыліся на працягу 2-х месяцаў з моманту пачатку продажу, склаў каля 8% ад першапачатковага кошту кватэры. Практыка паказвае, што пры павелічэнні названай велічыні цікавасць да кватэры з боку патэнцыйных пакупнікоў значна зніжаецца і, адпаведна, павялічваецца час продажу. У сітуацыі шырокага і пастаяннага павелічэння аб'ёмаў прапановы многія пакупнікі проста не звяртаюць увагі на кватэры, якія былі выстаўлены на продаж па цэнах, вышэйшых за сярэднярынкавыя. Атрымліваецца, што да такіх кватэр у большасці кліентаў справа нават не даходзіць.

У той жа час кватэры, прапанаваныя на продаж па мінімальных коштах, заўсёды ў фокусе попыту. Аднак для здзяйснення здзелкі з такімі кватэрамі мала адной толькі нізкай цаны — важна, каб затраты на магчымае правядзенне рамонту рэальна ўлічваліся пакупніком і не спужалі яго.

Больш за 20% студзеньскіх здзелак былі здзейснены жыхарамі іншых буйных гарадоў ці раёнаў Беларусі.

Асаблівасцю пачатку года стала павелічэнне актыўнасці іншагародніх пакупнікоў. Больш за 20% студзеньскіх здзелак былі здзейснены жыхарамі іншых буйных гарадоў ці раёнаў Беларусі. А вось іншаземцаў сярод іх больш не стала. Сёння на долю жыхароў Расіі прыпадае каля 2% рэальных пакупнікоў сталічнага жылля.

Мінімальны кошт 1 м² жылля новабудоўляў на этапе катлавана ў студзені склаў 799 долараў. Цэннік сфарміраваны для кватэр першых паверхаў, якія здадуцца ў эксплуатацыю нават без чарнавога адстройвання.

Аднапакаёўкі — ужо масава за 200 долараў

Кошты арэнды прыватнага жылля за апошні год зменшыліся ў сярэднім на 75 долараў для аднапакаёвых і на 120 долараў для двух- і трохпакаёвых кватэр. Сярэдні студзеньскі цэнік арэнды па выніках першага месяца года сфарміраваўся на ўзроўні 205 долараў для аднапакаёвых, 270 долараў для двухпакаёвых і 335 долараў у месяц для трохпакаёвых кватэр.

Рост курсаў валют і павелічэнне кошту жыллёва-камунальных паслуг прымушаюць арандатараў ісці на дыялог з уласнікамі па карэкціроўцы коштаў арэнды. Сапраўды, практыка арэндных адносін паміж большасцю кліентаў прадугледжвае аплату камунальных плацяжоў менавіта кватарантамі. Аднак пасля рэзкага павышэння кошту камунальных плацяжоў усё больш арандатараў сталі выступаць ініцыятарамі ўключэння кошту паслуг ЖКГ у кошт арэнды. Асабліва гэта актуальна для арандатараў кватэр, дзе ніхто не зарэгістраваны — у падобных кватэрах кошт камунальных паслуг асабліва высокі і можа дасягаць мільёна рублёў і больш нават за аднапакаёвую кватэру.

Каб застрахаваць сябе ад пастаяннага росту цэн арэнды з прычыны росту курсу долара, усё часцей кватаранты настойваюць на ўказанні ў дагаворы арэнды кошту ў беларускіх рублях.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Клімат

ЦЁПЛА І ВІЛЬГОТНА

Спецыялісты падлічылі, што сярэдняя тэмпература паветра трох месяцаў вясны будзе на 1-1,5 градуса вышэйшай за кліматычную норму

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёлета вясной у Беларусі прагназуецца цёплае і вільготнае надвор'е, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Ён адзначыў, што па паўднёвай палове краіны колькасць ападкаў будзе вышэйшай за норму, а ў паўночных рэгіёнах чакаецца прыкладна норма. «Гэта сведчыць аб тым, што ў прынцыпе вясна сёлета ў нас будзе вільготнай», — сказаў Дзмітрый Рабаў. Паводле яго слоў, добрыя ападкі нам будуць толькі на карысць, бо воднасць рэк цяпер недастатковая.

Начальнік службы адзначыў, што ў найбліжэйшы час усталюецца спакойнае надвор'е, калі па першай дэкадзе сакавіка сярэдні тэмпературны фон паветра будзе вышэйшым за норму на 5-7 градусаў. Ападкаў чакаецца ўжо па мінімуме, яны будуць кароткачасовымі і праходзіць месцамі.

Сёлета быў пастаўлены абсалютны зімні рэкорд па цеплыні. 22 лютага ў Пінску спецыялісты зафіксавалі плюс 11 градусаў.

ЗАПЛАНАВАЛІ І СУР'ЁЗНЫЯ ЗАМАРАЗКІ

Разам з тым да канца першай дэкады першага месяца вясны нас чакае непрацяглае пахаладанне. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 5 градусаў па поўначы да невялікага плюса ў паўднёвых рэгіёнах. Удзень прагназуецца ад нуля да 6 цяпла. Сіноптыкі падлічылі, што прыкладна ў сярэдзіне месяца (гэта 15-20 сакавіка) чакаецца прыток халоднага паветра, асабліва па паўночнай палове. У гэтыя дні ўначы тэмпература паветра там будзе апускацца да мінус 13 градусаў. Праўда, такое пахаладанне будзе непрацяглым, бо ў пачатку трэцяй дэкады зноў прыйдзе больш цёплае і камфортнае надвор'е.

А яшчэ Дзмітрый Рабаў адзначыў, што ў цэлым сакавік сёлета чакаецца цяплейшым, чым звычайна. Сярэдняя тэмпература паветра прагназуецца недзе на 1 градус вышэйшай за кліматычную норму, калі сяроднесутачная тэмпература будзе ад мінус 3 градусаў да 1 цяпла. Сярэднемесячная колькасць ападкаў таксама чакаецца вышэйшай за кліматычную норму. Галоўным чынам ападкі будуць выпадаць у выглядзе дажджу і мокрага снегу.

«ЗІСІ» ЗАСЫПАЎ МАГІЛЁЎШЧЫНУ І ВІЦЕБШЧЫНУ

Спецыялісты паведамляюць, што ў Магілёве за першыя суткі вясны выпала ў два разы больш дэкаднай нормы ападкаў (25 мм), а снежнае покрыва на раніцу 2 сакавіка склала 21 см, што адпавядае самаму высокаму паказчыку па вобласці.

Вялікая колькасць снегу выпала таксама ў Мсціславе і Клічаве, дзе снежнае покрыва дасягнула 16 см і 13 см адпаведна. Лідарам па колькасці ападкаў у выглядзе мокрага снегу і дажджу стала вёска Чыгірынка (Кіраўскі раён), дзе за суткі іх выпала ажно каля 40 мм.

За гэты час у Віцебску і Оршы таксама выпала дзве дэкадныя нормы ападкаў — 18 і 16 мм адпаведна. У Сянне цыклон пакінуў паўтары дэкадныя нормы — 13 мм. На астатняй частцы вобласці выпала ад 7% да 63% дэкаднай нормы, менш за ўсё — у Верхнядзвінску. Снежнае покрыва адзначаецца па ўсім рэгіёне, яго вышыня вар'іруецца ад 2 см у Докшыцах да 21 см у абласным цэнтры. У Віцебску, Оршы і Сянне снежнае покрыва за суткі павялічылася на 8-14 см.

А яшчэ Дзмітрый Рабаў паведаміў, што сёлета быў пастаўлены абсалютны зімні рэкорд па цеплыні. Так, 22 лютага ў Пінску спецыялісты зафіксавалі плюс 11 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Цікавінка міжсезоння

А ВЫ ВЕДАЕЦЕ, ДЗЕ СЯДЗІЦЬ ФАЗАН?

У Смалявіцкім раёне, каля вёскі Юр'ева, мясцовая паляўнічая гаспадарка арганізавала ўнікальнае паляванне — на выпускнога фазана. Ахвотнікаў папаляваць у міжсезонне, ды яшчэ і на рэдкую птушку, аказалася нямала: ва ўгоддзях сабралася каля паўсотні чалавек.

— Здабыча выгадаваных у вальерах фазанаў, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, можа праводзіцца цэлы год пры ўмове, што пра час і месца такога палявання арганізатар загадзя апавяшчае Дзяржінспекцыю. Гэтым разам за выкананнем правілаў назіралі супрацоўнікі Мінскай міжраённай і абласной інспекцый. Перад пачаткам паляванні яны яшчэ раз нагадалі яе ўдзельнікам аб бяспецы, — расказала прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч.

З выпушчаных ва ўгоддзі 165 птушак паляўнічым атрымалася здабыць 120 асобін, многія з якіх пасля стануць зайздроснымі трафеямі. У цэлым паляванне на фазана не вельмі адрозніваецца ад іншых відаў палявання на птушак. Для яе неабходны хуткі і вынослівы сабака, які прымусіць птушку падняцца ў паветра, а потым падбярэ здабытую дзічыну.

Дарэчы

Традыцыя палявання на паўвольную птушку — родам з сярэднявечнай Англіі. Спецыялісты сцвярджаюць, што сёння такая форма палявання здымае прэсінг, што аказваецца на дзікую прыроду. У большасці еўрапейскіх краін фазан вельмі паспяхова разводзіцца ў штучных умовах для патрэб паляўнічых гаспадарак.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ АДНЫМ ЗВАНКОМ

У Мінску і абласцях на сувязь выйдуць чыноўнікі ўсіх рангаў

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі працуюць ужо больш за год, таму шмат сур'ёзных праблем за гэты час вырашана. Часта просьбы, з якімі звяртаюцца грамадзяне, знаходзяць рашэнне да канца дня. У топе праблемных сфер паранейшаму — будаўніцтва, ЖКГ і транспартныя зносіны.

Нагадаем, штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній арганізавана з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. Стартавалі прамыя тэлефонныя лініі 17 студзеня 2015 года.

У гэтую суботу, 5 сакавіка, з 9.00 да 12.00 на сувязь з насельніцтвам выйдуць:

Брэсцкі аблвыканкам намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Віталевіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам старшыня КРАЎЦОЎ Уладзімір Васілевіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам кіраўнік спраў МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам старшыня ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам старшыня гарадскога Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васілевіч (80172224444).

■ Па той бок прылаўка

ЦЭНЫ ІДУЦЬ УНІЗ

Цэнавая сітуацыя на спажывецкім рынку стабільная, канстатуе Міністэрства гандлю, дадаючы, што за два месяцы года адзначаецца зніжэнне коштаў на свініну, паўвэнджаную каўбасу, абутак, мужчынскае і жаночае адзенне і г.д.

Спажывецкія цэны засталіся нязменнымі на аўтамабільны бензін, паслугі дашкольных устаноў і вышэйшай адукацыі. Як паведамляе міністэрства, у параўнанні з Цэнтральнай федэральнай акругай Расійскай Федэрацыі рознічныя цэны ў Беларусі на спажывецкія тавары ў сярэднім больш як на 10 працэнтаў ніжэйшыя. Па разліках Мінгандлю, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўзровень індэкса цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары знізіўся на 0,4 п.п.

Пры гэтым за студзень-люты Міністэрства гандлю праверыла 461 аб'ект гандлю і грамадскага харчавання, было складзена і накіравана ў судовыя органы больш за 700 пратаколаў, прыменена штрафных санкцый на суму больш як 2,7 мільярда рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Беражыце сябе!

НЕПАГАДЗЬ СПРАВАКАВАЛА АВАРЫІ

У сувязі з пагаршэннем умоў надвор'я павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў. За суткі ў Мінску зарэгістравана 165 аварый, гэта на 45 працэнтаў больш, чым у звычайныя дні.

onliner.by

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя чарговы раз заклікае ўсіх удзельнікаў дарожнага руху быць максімальна ўважлівымі і асцярожнымі ў складаных дарожных умовах. Паважаныя кіроўцы, выбірайце бяспечную хуткасць, выходзячы са стану праезнай часткі і бачнасці ў напрамку руху! Акрамя таго, рэкамендуецца павялічыць не толькі дыстанцыю да аўтамабіля, які знаходзіцца наперадзе, але і бакавы інтэрвал. Пры галалёдзіцы суседнюю машыну можа нечакана развярнуць. Трэба пазбягаць рэзкіх тармажэнняў, каб не спрацаваць ДТЗ. Пешаходам таксама варта праяўляць павышаную ўвагу. Варта пераходзіць дарогу толькі ва ўстаноўленых месцах. Нават на рэгуляваных пешаходных пераходах нельга пачынаць пераход, пакуль усе аўтамабілі не спыняцца. Трэба пазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

(организатор аукциона) извещает о проведении 4 апреля 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	д. Чуденичи, ул. Садовая, 6 (уч. № 97), кадастровый номер 623286308101000379	0,1197	Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования	38 056 700	3 805 670	13 583 300
2	д. Чуденичи, ул. Молодежная 2-я, 4 (уч. № 77) кадастровый номер 623286308101000381	0,1200	Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования	38 152 100	3 815 210	13 583 300
3	д. Чуденичи, ул. Молодежная 2-я, 10 (уч. № 74) кадастровый номер 623286308101000382	0,1198	Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования	38 088 500	3 808 850	13 583 300

Дата, время и место проведения аукциона: **4 апреля 2016 года в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.**

Прием документов: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресения) **по 29.03.2016 г. включительно;** к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 153001601, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель Острошицкий сельский исполнительный комитет.

Условия: победитель обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Контактные телефоны для справок: **(801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 6444886.**

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

ООО «Датч Стар»,

опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:

«...стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир площадью **65,44 кв.м** на 4 этаже – 1100 (одна тысяча сто) долларов США, площадью **89,84 кв.м**, на 9 этаже – 1300 (одна тысяча триста) долларов США, площадью **68,69 кв.м**, на 4 этаже – 970 (девятьсот семьдесят) долларов США.»

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 153 33 24, 8 (044) 781 81 17.

УНП 191061436

КАМУ СЫР З ЦВІЛЮ...

Фота БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, даволі часта людзі выбіраюць не самыя карысныя прадукты. Напрыклад, мясныя прадпрыемствы прапануюць шэраг разнастайных паўфабрыкатаў і гатовы далей развіваць гэту нішу, але зрух у бок спажывання падобнай прадукцыі невялікі. У нас больш, чым у Еўропе, гаспадыні набываюць каўбасных вырабаў. Можа, гэта сведчыць пра ляноту і нежаданне шмат часу чараваць ля пліты з мясам? Ці мы проста набываем тое, што танней і да чаго прызвычаіліся? Але нават тую ж вараную каўбасу трэба ўмець выбіраць.

— Тры гады назад мы ўвялі ў стандарт гатунак варанай каўбасы «экстра» — па сутнасці, гэта тыя каўбасныя вырабы, якія вядомы старэйшаму пакаленню і ствараюцца на аснове савецкага дзяржаўнага стандарту 1979 года. Тут выкарыстоўваецца добрая сыравіна, не прымяняецца вялікай колькасці дабавак. Вядома, каўбасы гатунку «экстра» даражэйшыя, але таму, што працэнтная колькасць мяса тут вышэйшая, і сыравіна (ялавічына ці свініна) лепшая, чым у іншых вырабах, — заўважае Аляксей Меляшчэня. — Я парэкамендаваў бы спажыўцам пры выбары сасіскаў ці сардэлек звяртаць увагу на прадукцыю, на якой пазначана, што яна выраблена для дзіцячага харчавання. Патрабаванні да яе больш жорсткія і па якасці сыравіны, і па наяўнасці розных рэчываў. Праўда, каштуе яна крыху даражэй, але гэта апраўдана — тут выкарыстоўваецца лепшая сыравіна. Аб'ёмы такой прадукцыі невялікія толькі таму, што пакупнік часта выбірае тое, што танней. Акрамя таго, на дзіцячай прадукцыі меншыя тэрміны прыдатнасці, што не зусім прымальна для гандлю.

— Ці азначае гэта, што больш танныя прадукты менш карысныя?

— Не зусім так. Згадаем вырабы з выкарыстаннем субпрадуктаў — напрыклад зельцы, сальцісоны. Яны параўнальна недарагія, але праз колькасць калагену вельмі карысныя для людзей старэйшага пакалення, асабліва тых, што маюць праблемы з суставамі. Але што да каўбас, сапраўды, пры вытворчасці больш дарагіх мясных прадуктаў выкарыстоўваецца сыравіна, больш каштоўная з пункту гледжання хутчэй смакавых пераваг (па колькасці бялку розніца не істотная), якая лепш засвойваецца.

ЭКСКЛЮЗІЎНАЕ МЯСА БАБРА

— Чаму беларускія мясныя і малочныя прадукты так падабаюцца суседзям?

— Нашы прадукты папулярныя ў Расіі, Украіне таму, што прадпрыемствы стараюцца мінімізаваць, наколькі магчыма, прымяненне харчовых дабавак, замяняльнікаў тлушчаў і г.д. І прамысловасць з вялікім задавальненнем будзе прапаноўваць прадукты натуральныя, нават зусім без дабавак, калі спажывец будзе выбіраць такую прадукцыю.

— Атрымліваецца, спажывец сам стымулюе вытворчасць ненатуральнай прадукцыі?

— Праблемай становіцца ўсё большае прымяненне ўзмацняльнікаў смаку. Мы актыўна гэтаму супраціўляемся, але, тым не менш, не можам спыніць. На жаль, штодзень спажыўцы (асабліва гэта бяда маладога пакалення) атрымліваюць узмацняльнік смаку з розных прадуктаў. Ён збівае смакавыя ўспрыманні і выклікае прывыканне. Людзі спецыяльна пачынаюць шукаць такія прадукты. Безумоўна, ніякай карысці арганізму няма і ад фарбавальніку, але многія спажыўцы выбіраюць мясную прадукцыю, на іх погляд, больш прывабную. Чым яна ярчэйшая, прыгажэйшая — тым больш дабаўлена фарбавальнікаў, кансервантаў і г.д. У натуральным выглядзе звараное мяса шэрае, і з нашага пункту гледжання менш прыгожае. Праўда, існуюць і пэўныя прыёмы, як зрабіць яго прыгажэйшым. Напрыклад, замест нітрыту натрыю выкарыстоўваецца аскарбінавая кіслата.

Трэцяя некарысная група — кансерванты. Зразумела, тое, што забівае маленькую бактэрыю, у вялікіх дозах шкодзіць і здароўю чалавека. Гандлёвыя прадпрыемствы ўносяць сваю лепту ў развіццё гэтых нядобрых тэндэнцый, ім патрэбны прадукты, якія будуць доўга захоўвацца. Чым большы тэрмін прыдатнасці, тым карыснасць прадукцыі ніжэйшая альбо тым больш прымянена стабілізатараў, кансервантаў, загушчальнікаў, якія перашкаджаюць яе псаванню. За кошт прымянення тэхнічных прыёмаў, правільнай арганізацыі вытворчасці можна дасягнуць пэўных тэрмінаў прыдатнасці. Для мясных прадуктаў, паўфабрыкатаў і вараных каўбас тэрмін прыдатнасці — да 30 сутак, для вэнджаных і сыравяленых каўбас 3-5 месяцаў. Безумоўна, выкарыстанне дабавак рэгламентуецца. Але праблема ў тым, што мы можам спажываць іх кожны дзень і з розных прадуктаў. Мы і нашы калегі медыкі заўсёды рэкамендуем звяртаць увагу на ўпакоўку, у нашай краіне жорсткія патрабаванні да яе. Там усё распісана: чым карацейшы спіс складнікаў, тым прадукт больш натуральны.

— Ці праўда, што ў найбліжэйшы час беларусы змогуць пакаштаваць мяса бабра?

— Так, мы распрацоўвалі дакументацыю па гэтай прадукцыі, праводзілі комплексныя ацэнкі. Але такая прадукцыя не можа быць масавай, хутчэй — эксклюзівам. Магчыма, мяса бабра будзе выкарыстоўвацца пры вырабе асобных відаў паляўнічых каўбасак. Калі ў пэўных мясцінах гэты звер наносіць шкоду і адстрэльваецца, паляўнічым даводзіцца думаць, што з ім рабіць. Гэтак жа мы стваралі дакументацыю на мяса лася, казулі, дзіка.

ЧЫТАЙЦЕ ЭТЫКЕТКІ!

— Чаму такія дарагія нашы сыры?

— Для вытворчасці кілаграма сыру патрэбна прыкладна 10 літраў малака. Калі падлічыць, атрымаецца, што цэны адэкватныя. І сыроў беларусы сталі больш спажываць. У часы Савецкага Саюза ў нашай краіне іх выраблялася да 40 тысяч тон, цяпер амаль 170 тысяч, і, думаю, лічба давядзецца да 200 тысяч тон. Але калі вытворчасць выросла ў 4-5 разоў, спажыванне на ўнутраным рынку — толькі на 30 працэнтаў. Між іншым, гэта вельмі карысны прадукт — засваенне кальцыю з сыру амаль 97 працэнтаў, з тварагу — 95.

— Як беларускія вытворцы выхоўваюць густы спажыўца?

— Сёння прадпрыемствы па сваім узроўні тэхнічнага развіцця, кадравым патэнцыяле гатовыя, па сутнасці, выпускаць любую прадукцыю, якая ёсць у малочным свеце. Многае ўпіраецца ў попыт. Так, мы развіваем лінейку сыроў з цвіллю. Сёння ў нас амаль няма сваіх мяккіх сыроў, але мы вырабляем падобны па спосабу вытворчасці і смакавых характарыстыках прадукт — тварог (дарэчы, нехарактэрны для Еўропы, як і смятана, ражанка, прастакваша). Былі спробы запусціць на нашым рынку безлактозныя ці малалактозныя прадукты (у Еўропе яны папулярныя). Мяркую, падобная карысная і неабходная людзям з праблемамі, якія тычацца засваення малочнага цукру, прадукцыя на нашым рынку яшчэ зойме годнае месца. Складана сказаць, што ў нас няма нейкай прадукцыі, як, напрыклад, у Еўропе, на якую ёсць попыт. Апошнія 5-7 гадоў доля спажывання імпартных малочных прадуктаў у Беларусі складае ўсяго 2-3%, пераважна гэта тычыцца сухіх сумесяў для дзіцячага харчавання, асобных відаў сыроў і ёгуртаў.

— Якую прадукцыю выбіраць для дзяцей?

— Прадукт для дзяцей павінен змяшчаць на сваёй маркіроўцы выраз «для дзіцячага харчавання». На ёгуртах могуць быць яркія малюнкі, памяншальныя назвы, якія прывабліваюць малых, але калі на ім не пазначана, што гэта прадукцыя для дзяцей, лепш пашукаць іншы тавар. Гэта можа быць у цэлым і нядрэнны прадукт, але тыя вельмі жорсткія патрабаванні, што тычацца дзіцячай прадукцыі, на яго не распаўсюджваюцца. Там можа быць празмерная колькасць кальцыю, які не будзе засвойвацца. Трэба звяртаць увагу на тэрміны прыдатнасці. Для прадуктаў ёгуртнай групы дзіцячага харчавання — у межах да двух тыдняў, для дзяцей з года да трох — не больш за 10 дзён. Звяртайце увагу на айчынную прадукцыю — вы не сустрэнеце падобных беларускіх малочных прадуктаў, у якіх тэрмін прыдатнасці 40 дзён. А ў імпартных ёгуртах з тэрмінам прыдатнасці 60 сутак і болей нічога карыснага вы не знойдзеце.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

■ Тэрыторыя бяспекі

КАБ ЗАЎСЁДЫ БЫЎ... «НУЛЬ»

Наколькі ад ратавальнікаў залежыць «нулявая» статыстыка па трагедыях, карэспандэнт «Звязды» высветліў, правёўшы адзін працоўны дзень з начальнікам Лёзненскага раённага аддзялення па надзвычайных сітуацыях Віталём ЧАЙКІНЫМ. Выбар невыпадковы, бо маёр унутранай службы сёлета быў названы «Чалавекам года Віцебшчыны».

Віталь ЧАЙКІН у раённым аддзеле МНС.

На апярэджанне

Яшчэ не было 8 гадзін раніцы, калі мы сустрэліся ў кабінеце Віталя Барысавіча. Але размовы не атрымалася: перыядычна заходзілі падначаленыя, трэба было неадкладна падпісаць службовыя паперы...

Потым пачаўся развод і перадача дзяжурства іншай змене каравула. Асабовая частка выстраілася шарэнгамі. Сярод супрацоўнікаў — прыгожая дзяўчына Кацярына. Начальнік павіншаваў яе з днём нараджэння. Выслухаў пра становішча. Дзяжурныя, заступаючы на змену, праверылі машыны і абсталяванне: ці ўсё на месцы, ці ў працоўным стане. Ратавальнікі паказалі мне аўтацыстэрны, сродкі ратавання. У тым ліку і прыстасаванні для аказання дапамогі на вадзе.

— Пакуль на тонкім лёдзе здарэнняў не было. Актыўна прыцягваем да прафілактычнай работы грамадзян. Просім старшакласнікаў сачыць за малодшымі школьнікамі, дарослых — за дзецьмі. Рыбакі — асобная гісторыя. Ім прыходзіцца ўвесь час нагадваць, што жыццё даражэйшае за ўлоў. Кантралюем вадаёмы, праводзім сумесныя рэйды з зацікаўленымі службамі, — расказвае маёр.

Насельніцтва вельмі актыўна дапамагае ратавальнікам і ў прафілактыцы пажараў. Тут раёну ёсць чым ганарыцца — за мінулы год ад агню на Лёзненшчыне не загінуў ніводзін чалавек.

Дарэчы, у гэтым раёне з дапамогай праграмы ў межах праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» будзе створаны цэнтр бяспекі. Пры цэнтры мяркуецца абсталяваць спецыялізаваную інфармацыйна-гульнявую пляцоўку для дзятвы, каб навучыць апошнюю правільна і бяспечна ліквідаваць загаранні. Для добраахвотнай пажарнай дружыны ў аграгарадку Кавалі набылі аварыйна-ратавальнае абсталяванне. Усё гэта дазволіць навучыць правілам бяспекі як мага больш жыхароў.

Пажарныя дружыны на Лёзненшчыне створаны пры чатырох гаспадарках. Для тэхнікі спецыяльна пабудавалі боксы. Добраахвотнікі дапамагаюць ужо шмат гадоў: гутараць з аднавяскоўцамі, вучаць, як дзейнічаць пры надзвычайнай сітуацыі, самі ліквідуюць пажары....

Ды і самі лёзненскія ратавальнікі — людзі актыўныя і вядомыя не толькі ў раёне. Яны перамагаюць на розных ведамасных спаборніцтваў, прызнаюцца найлепшымі спартсменамі і прафесіяналамі.

Сумна не будзе

Віталь Барысавіч на пасадзе пяты год. Яго дзед працаваў сакратаром у газеце, а бабуля, ёй 80 гадоў, заслужаная настаўніца Рэспублікі Беларусь, выкладала фізкультуру, была кіраўніком мясцовага Дома піянераў, вельмі творчы чалавек па натуры. Іх дом заўсёды быў поўны таленавітымі людзьмі.

Пакуль мы ўрыўкамі гутарым, надыходзіць час пасяджэння камісіі ў райвыканкаме, якая займаецца пытаннямі прафілактыкі. Галоўная тэма на гэты раз — бяспека пры карыстанні газавымі прыборамі.

У Крынкаўскай сярэдняй школе імя Міхася Лынкова Віталь Чайкін планаваў правесці хвілін 20. Затрымаўся на дзве гадзіны. Школа, дарэчы, мае кнігу з аўтографам славутага земляка, імя якога носіць. Сёлета споўніцца 55 гадоў, як яе наведаў Міхась Лынькоў, ён тады расказваў школьнікам пра паездку ў ЗША ў якасці дэлегата сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

У навучальнай установе маёр Чайкін праверыў веданне правілаў пажарнай бяспекі. Усе настаўнікі і вучні дакладна адказалі на пытанні. Затым начальнік аддзялення па надзвычайных сітуацыях пагутарыў са старшакласнікамі: паведаміў пра спецыялізаваныя вышэйшыя ўстановы МНС. Паабяцаў, што той, хто стане ратавальнікам, сумаваць не будзе. Бо праца вельмі цікавая.

Як член прэзідыума раённага Савета дэпутатаў Віталь Барысавіч курыруе работу з моладдзю. На асабістым прыкладзе прывучае да здаровага ладу жыцця і заняткаў спортам. Ратавальнікі ў школе частыя госці. Гуляюць са старшакласнікамі ў камандныя гульні, настольны тэніс і шашкі. Неяк у валейбол... прайгралі дзецям. Для апошніх такія сустрэчы — сапраўднае свята. Як вынік, 9 выпускнікоў летась вырашылі стаць ратавальнікамі.

Да аўтаматызму

Пасля школы наступны візіт — на чыгуначную станцыю Крынкі. Тут якраз рыхтаваліся прыняць дызель з Расіі. Начальнік станцыі Дзіяна Гагалінская пачула ад маёра МНС і яго намесніка добрыя словы за адсутнасць парушэнняў. Афіцэры падкрэслілі, што на чыгункі працуюць людзі, якія разумеюць, што бяспека — гэта галоўнае, і ў дробязях трэба выконваць прапісанае.

У Крынкаўскім сельскім выканкаме старшыня запэўніла ратавальнікаў, што ўсе праблемныя дамы праверaны, ёсць пажарныя апавяшчальнікі, а жыльцы праінструктаваны аб мерах бяспекі...

На пажарным аварыйна-ратавальным пасту ў Крынках дзяжураць усяго два ратавальнікі. Каб у выпадку надзвычайнай сітуацыі справіцца з любой задачай, яны да аўтаматызму даводзяць свае дзеянні па тушэнні магчымага пажару. Хлопцы на «выдатна» прадэманстравалі маёру свае навыкі і ўменні.

Потым мы вярнуліся ў Лёзна, падчас перапынку папілі кавы. Я ўжо выматаўся, а суразмоўца мой быў поўны энергіі. Сказаў, што спецыяльна для журналіста сёння нічога не арганізоўвалася па рабоце: звычайны дзень. А ён у яго ненармаваны. Таму часта прыходзіць дамоў, дзе яго чакаюць жонка і трохгадовая дачка, бліжэй да ночы. Мабільны тэлефон заўсёды пад рукой.

У другой палове дня начальнік МНС раёна вырашаў розныя пытанні з падначаленымі, тэлефанаваў па службовых справах. Падвёз карэспандэнта да аўтастанцыі. На развітанне я пажадаў яму заўсёды мець «нуль». Меў на ўвазе статыстыку — колькасць тых, хто пацярпеў або загінуў. Для гэтага маёр з калегамі робяць усё магчымае.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Фота аўтара.
Лёзненскі раён — Віцебск

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 САКАВІКА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15788)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Настасся ШПАКОЎСКАЯ:

«Я СТАЛА БОЛЬШ ГНУТКАЙ, АЛЕ...»

Гурт Naka зноў парадаваў сваіх прыхільнікаў — свет убачыў новы альбом на беларускай мове «Мая малітва». На тры кампазіцыі з яго ўжо зняты відэакліпы. А 8 сакавіка адбудзецца афіцыйная прэзентацыя пласцінкі. Яе сацыяльна-лірычны настрой для адных стане магчымасцю парадавацца за любімы гурт, для іншых — пераканацца, што ў беларускім року ёсць годныя прадстаўнікі, і, магчыма, створыць глебу для разважанняў. Мы сустрэліся з салісткай групы і яе стваральніцай Настассяй Шпакоўскай, каб пагутарыць пра музыку, літаратуру і выратавальную сілу кахання.

— Любы новы альбом — вялікая падзея ў жыцці групы, паколькі ён адлюстроўвае пэўны этап у творчасці. «Мая малітва» — пласцінка з няпростым лёсам. Да яе выпуску мы ішлі цэлы год. Хоць яшчэ паўтара года таму не збіраліся рабіць беларускамоўны альбом і жылі зусім іншымі планамі. Аднак падзеі, звязаныя з песняй «Мая малітва», змянілі наш кірунак. Склалася канцэпцыя альбома. Там ёсць не толькі песні ў сольным выкананні, а і дуэт, трыа. І ўвогуле, на мой погляд, пласцінка атрымалася лірычна-ваяўнічай і разам з тым спавядальнай. Я з нецярплівасцю чакаю прэзентацыі.

— Відаць, яе дата выбрана не выпадкова?

— Хацелася падкрэсліць жаночы пачатак нашага альбома і, спадзяёмся, некаторыя слухачкі атрымаюць квіток на наш канцэрт у якасці падарунка на гэтае свята. І тады мы зможам з усімі падзяліцца думкамі пра каханне, расказаць пра тое, што нас сёння хвалюе.

— На глебе чаго ўсё ж такі ўзнік ваш канфлікт з Алегам Молчанам?

— Прадзюсар Сяргей Будкін у гонар юбілею ансамбля «Песняры» рабіў канцэртную праграму з намерам выдаць альбом, дзе песні легендарнага гурта выконвалі б беларускія каманды. Naka выбрала для выканання песню «Мая малітва» на верш Янкі Купалы.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Элемент дэмакратыі

ПЕРАКАНАЦЬ СЛОВАМ

ПРА КАРЫСЦЬ ДЭБАТАЎ У ЖЫЦЦІ

Быць сапраўдным дэбацёрам — гэта здолець разабрацца ў любой геапалітычнай, эканамічнай ці сацыяльнай праблеме за 30 хвілін. Вучаніца 11-га класа сталічнай гімназіі №7 Уладзіслава СЕНКЕВІЧ, удзельніца некалькіх міжнародных турніраў, гаворыць, што падчас дэбатаў раскрываецца сапраўдны інтэлект апанента.

Для таго, каб удзельнічаць у дэбатах, вам спатрэбяцца дзве каманды, таймкіпер, які будзе сачыць за часам, і некалькі суддзяў. Традыцыйна каманда складаецца з трох чалавек. Перад гульнёй лёсаванне вырашае, хто гуляе «за», а хто «супраць».

Першы гулец агучвае «кейс» — тэкст з аргументамі наконт пэўнай праблемы. Ён можа быць загадзя падрыхтаваны ці не, у залежнасці ад правілаў турніру. Некаторыя спаборніцтвы праходзяць толькі па вядомай тэме. На іншых ёсць раўнд, дзе прадмет абмеркавання называецца за паўгадзіны да гульні. І каманда павінна за гэты час знайсці доказы для сваёй пазіцыі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Паўфіналісты восеньскага турніру.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ідэі маладых

ПАТУШЫЦЬ ПАЖАР... ПІЛАВІННЕМ

У Мінску прадставілі найлепшыя праекты юных вынаходнікаў

Нядаўна ў сталіцы чарговы раз прайшоў фінал штогадовага навукова-інжынернага конкурсу навучэнцаў «Belarus Science and Engineering Fair» (BelSEF). Спаборніцтва па сутнасці з'яўляецца нацыянальным адборам да вялікага міжнароднага форуму «Intel International Science and Engineering Fair», які ў маі пройдзе ў амерыканскім Фініксе. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі мерапрыемства і пазнаёміліся з лепшымі праектамі беларускіх школьнікаў і навучэнцаў.

Распрацоўка Дар'і ЗАЛЕСКАЙ са Старобіна можа ўратаваць не адно дрэва.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

...Па падлозе павільёна раз'язджае невялікая платформа з прымацаванай да яе... рукой. Вядома, канечнасць штучная — гэта робат, створаны хлопцамі з праекта SenseDrive. Здавалася б, каго можна здзівіць маніпулятарам, няхай сабе і чалавекападобным? Але галоўная «фішка» вынаходніцтва ў іншым — рукой і платформай кіруе аператар пры дапамозе віртуальных акуляраў. Атрымліваецца такі сімбіёз робататэхнікі і прынцыпаў віртуальнай рэальнасці. «Кіроўца» быццам бы ўсяляецца ў корпус машыны і бачыць усё яе «вачыма».

— Да стварэння робата мяне падштурхнула само жыццё, — распавядае **навуковы кіраўнік праекта, супрацоўнік кампаніі CactusSoft Раман ЦІТОЎ.** — Справа ў тым, што мая мама жыве ў Магілёве, а сам я працую ў Мінску. Яна ўжо на пенсіі, таму пастаянна быць побач з ёй не атрымліваецца. Нават зрабіць элементарную рэч — падаць таблеткі — не магу. Робат жа можа стаць маім «аватарам», які заўсёды знаходзіцца паблізу маці. Мне дастаткова надзець акуляры, «тэлепартавацца» ў Магілёў і ўбачыць з яго «кабіны», што адбываецца дома.

Рэалізацыяй задумы займаліся дзевяцікласнікі сталічнай гімназіі №50 Максім Клімовіч, Антон Паграбенка і Аляксей Русакоў. Хлопцы кажуць, што варыянт, які існуе, — гэта толькі прататып. Самае простае, што можа рабіць машына, — паўтараць за аператарам усе рухі яго пальцаў і перамяшчацца ў прасторы. Але ўжо ёсць матэматычныя рашэнні для таго, каб надаць робату сапраўды сур'ёзны функцыянал: ён зможа рухаць і локцевым суставам, падымацца на вышыню чалавечага росту і іншае.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 03 2016 г.

ПАТУШЫЦЬ ПАЖАР... ПІЛАВІННЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)

У перспектыве можна стварыць сапраўднага антрапаморфа, які цалкам будзе паўтараць знешні выгляд чалавека і зможа рабіць усё тое ж, што і яго аператар.

Былі на выставе і праекты, якія могуць прыносіць плён «тут і цяпер». Так, напрыклад, **навучэнка 9 класа Старобінскай сярэдняй школы Дар'я ЗАЛЕСКАЯ** стварыла новую сумесь для папярэджання лясных пажараў — эказол «Тры мядзведзі». Галоўная вартасць распрацоўкі — яе абсалютная экалагічнасць, бо аналагі, якія існуюць, моцна шкодзяць навакольнаму асяроддзю. Безумоўна, улічваўся і эканамічны аспект — аўтарка імкнулася зрабіць сумесь таннейшай за аналагі.

Прапелералёт Аляксея БАРЫСЕВІЧА — не чарговы квадракоптар, а ўнікальная распрацоўка.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Каманда праекта SenseDrive і іх робат-аватар.

— Мы правялі шэраг эксперыментаў для таго, каб знайсці найбольш удалы хімічны састаў, — распавядае Дар'я. — Ім аказалася сумесь сасновага пілавіння, апрацаванага казеінавым клеем, з тарфяным попелам у суадносінах 1 да 2. Сабекошт аднаго кілаграма склаў 16,5 тысячы рублёў. Небяспечныя аналагі, якія ўтрымліваюць фосфар і алюміній, каштуюць каля паўмільёна за такую ж колькасць. У лабараторных і палявых эксперыментах новы інгібітар перашкаджаў гарэнню не горш за існуючыя.

Цяпер стваральнікі думаюць пра ўкараненне распрацоўкі. Дар'я мяркуе, што сумесь можна было б прадаваць у наборах разам з вуголлем і палівам для вогнішчаў, якія людзі набываюць для адпачынку на свежым паветры. Калі адмежаваць ачаг палоскай з новага інгібітару, пра магчымае ўзгаранне можна не хвалявацца. Праектам ужо зацікавілася Старобінскае лясніцтва — мяркуецца, што сумессю можна будзе пасыпаць супрацьпажарныя разоры ўздоўж дарог.

Навучэнка жодзінскай гімназіі №1 Аляксандра КАХАВЕЦ прапанавала праект «Экалагічны шлях развіцця сучасных гарадоў».

— Мы стварылі эканамічную і эфектыўную сістэму азелянення дахаў, якая мае ўласную сістэму паліву, — кажа аўтарка. — Акрамя гэтага, склалі спіс шматгадовых раслін, якія можна вырошчваць у такіх умовах. Скажам, расходнік, пырнік, аўсяніцу, мятліцу і іншыя. Разам з архітэктарамі высветлілі, што ў нашым горадзе такія пасадкі можна размясціць на 70% дамоў.

Найбольш эфектыўнай для азелянення будзе аснова з некалькіх слаёў: керамзіту, глебы і льняной тканіны. Асаблівы прадмет гонару стваральнікаў — аўтаматычная сістэма паліву, якая спрацоўвае, калі лён пад глебай высыхае. Такім чынам дасягаецца эканомія вады. Яшчэ адзін плюс — эканомія на электраэнергіі і ацяпленні апошніх паверхаў будынкаў, бо «зялёны дах» працуе як коўдра.

Праектам ужо зацікавілася Старобінскае лясніцтва — мяркуецца, што сумессю можна будзе пасыпаць супрацьпажарныя разоры ўздоўж дарог.

Увогуле, цікавых праектаў на конкурсе хапала. **Адзінаццацікласнік Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя Аляксей БАРЫСЕВІЧ** стварыў гібрыд самалёта і верталёта — прапелералёт. Машына ўзнімаецца ў паветра вертыкальна, пасля чаго пераходзіць у рэжым разгону і ляціць ужо гарызантальна. Сістэма дазваляе адмовіцца ад даўжэзных узлётных палос, захоўваючы звыклую для самалётаў хуткасць. Ужо гатовы і прататып, які знаходзіцца ў стадыі дапрацоўкі. Пакуль машыне цяжка перайсці ад вертыкальнага да гарызантальнага руху, але аўтар абяцае найбліжэйшым часам вырашыць праблему. **Дарэчы, прадстаўляць Беларусь на конкурс Intel ISEF у ЗША адправяцца і Аляксей Барысевіч, і Дар'я Залеская.**

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
БРСМ
ЧЫРВОНКА

У МУЗЕІ НА МОДНАЙ ЛАЎЦЫ

Дызайнерскія лаўкі з'явіліся на тэрыторыі Нацыянальнага мастацкага музея ў сталіцы.

Гэтыя арт-аб'екты былі ўсталяваныя ў холе новага корпуса падчас маладзёжнай флэш-акцыі «Падарунак у Год культуры», якая дала старт Форуму галіновых камітэтаў і пярвічных арганізацый Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі міністэрстваў і ведамстваў нашай краіны. Мінчане і госці беларускай сталіцы змогуць цяпер не толькі прысесці і сфатаграфавацца на модных лаўках, але і пазнаёміцца з творчасцю маладых мастакоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якія адлюстравалі на сваіх незвычайных карцінах элементы мінулага Года моладзі і сёлетняга Года культуры.

Фота БЕЛТА.

НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ ВУЧНІ НАСТАЎНІКАЎ

У Прудкоўскай базавай школе Светлагорскага раёна вось ужо больш за дванаццаць гадоў дзейнічае штаб «Міласэрнасць», удзельнікі якога, апроч іншых карысных спраў, часта наведваюць настаўнікаў-ветэранаў.

— Толькі ў самой вёсцы пражываюць тры такія заслужаныя чалавекі. На ўсе святы Святлана Падліпская, Дар'я Ронжына, Настасся Гапановіч, Юра Гусак рыхтуюць для іх святочныя паштоўкі са словамі віншаванняў, запрашаюць колішніх настаўнікаў да нас у школу, — расказала педагог-арганізатар навучальнай установы, куратар пярвічкі БРСМ Людміла Уладзіміраўна Папонава. — Ды што там у святы, дзеці часта наведваюць ветэранаў і ў будныя дні. Вам не перадаць словамі, як праходзяць такія сустрэчы! З абдымкамі, пацалункамі, з размовамі пра родную школу! Нашы вучні таксама стараюцца дапамагчы заслужаным педагогам па гаспадарцы ва ўсім, у чым тыя маюць патрэбу. Вось хутка збіраемся складваць на іх падворках дровы.

Люстэрка статыстыкі

МАЛАДЫЯ ГАТОВЫ «КРУЦІЦЦА», але галоўныя каштоўнасці для іх — бацькі і здароўе

Што ў прыярытэце ў сённяшніх юнакоў і дзяўчат? Каб высветліць гэта, Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ і Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі правялі ў 2014–2015 гадах маніторынг. Першыя вынікі даследавання былі агучаны падчас пасяджэння Рэспубліканскага маладзёжнага савета пры міністру адукацыі.

Адказваючы на пытанне «Якія праблемы вас хвалююць?», большасць беларусаў ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў назвала ўзровень аплаты працы. Гэта актуальна для 55 працэнтаў моладзі. Цэны на прадукты і тавары першай неабходнасці непакояць 53,5 працэнта апытаных, жыллёвыя праблемы — 46 працэнтаў. Амаль 43 працэнты юнакоў і дзяўчат хвалюе інфляцыя і абясцэньванне грошай. У пяцёрцы праблем апынуўся таксама рост п'янства (гэту тэндэнцыю адзначыла траціна маладых людзей).

Каб жыць забяспечана, студэнты і выпускнікі гатовы «круціцца». 64 працэнты запэўнілі, што ў выпадку пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў краіне будуць самастойна шукаць любыя шляхі паляпшэння свайго жыцця. Гэты варыянт часцей называлі дзяўчаты і тыя, каму ад 20 да 24 гадоў. Кожны дзявяты прызнаўся, што пойдзе за большасцю. Такая канфармісцкая пазіцыя ўласціва, хутчэй, моладзі ва ўзросце 18-19 гадоў. Яшчэ 9 працэнтаў адказалі, што проста будуць чакаць больш спрыяльных часоў. Сёмая частка апытаных так і не змагла вызначыцца са сваімі дзеяннямі ў крызіс. Як правіла, чым маладзейшы рэспандэнт, тым складаней яму было ўявіць выхад з гэтай сітуацыі.

У цяжкім становішчы юнакі і дзяўчаты ў найбольшай ступені спадзяюцца на сям'ю. Амаль палове апытаных родныя дапамагаюць ва ўсіх сітуацыях. Яшчэ 29 працэнтаў адзначылі, што могуць разлічваць на падтрымку сваякоў у большасці выпадкаў.

Высокае становішча ў грамадстве, улада і магчымасць уплываць на іншых людзей апынуліся ў нізе рэйтынгу каштоўнасцяў.

Ці праўда, што ўсё вырашаюць грошы? Пятая частка моладзі ўпэўнена: з поўным кашальком не страшныя ніякія праблемы. А два працэнты мяркуюць, што грошы ніяк не дапамагаюць па жыцці.

Паціка вяліся ў маладых людзей і пра тое, што для іх важна ў рабоце. На першае месца спецыялісты-пачаткоўцы паставілі высокі заробак. Другім па значнасці назвалі такі крытэрый, як добрыя ўмовы працы. Доступ да льготаў, сацпакета і сацыяльных гарантый мае значэнне для 44 працэнтаў апытаных. Рэспандэнты ва ўзросце 21-30 гадоў таксама хочуць паспяхова прасоўвацца па службе і рабіць кар'еру. А вось рэалізаваць свае веды, вопыт і кваліфікацыю важна толькі для чвэрці з іх.

Калі казаць пра каштоўнасці цяперашняй моладзі, то ў тройцы прыярытэтаў апынуліся бацькі, здароўе і каханы чалавек. На чацвёртае месца паставілі матэрыяльна забяспечанае жыццё. Сярод найбольш важнага — дзеці, душэўны спакой і камфорт. А вось высокае становішча ў грамадстве, улада і магчымасць уплываць на іншых людзей апынуліся ў нізе рэйтынгу каштоўнасцяў.

Галоўным СМІ назвалі інтэрнэт. Праз сеціва беларуская моладзь атрымлівае 90 працэнтаў інфармацыі. 91 працэнт апытаных заходзяць у анлайн кожны дзень. І толькі адзін са ста рэспандэнтаў не карыстаецца інтэрнэтам увогуле. Самай папулярнай сацыяльнай сеткай у моладзі застаецца «УКантакце». На другім месцы — «Фэйсбук» і «Аднакласнікі», на трэцім — «Твітэр».

Як правесці вольны час? Вырашаючы гэта, юнакі і дзяўчаты аддаюць перавагу варыянтам, якія дапамагаюць палепшыць здароўе і падтрымаць добрую форму ці пазабаўляцца. Менш за ўсё ў вольны час моладзь хоча далучацца да мастацтва і атрымліваць эстэтычную асалоду. Таму месцамі адпачынку часцей становяцца паркі атракцыёнаў, трэнажорныя залы і кінатэатры. А вось бібліятэкі і гурткі па інтарэсах цікавяць куды менш.

На сваю будучыню моладзь глядзіць з аптымізмам. Згодна з даследаваннем, больш за палову лічаць, што ў найбліжэйшы час іх жыццё зменіцца да лепшага.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

«ШУКАЮ ГАСПАДАРА САБАКІ»

Адзінаццацікласнік слуцкай гімназіі №1, член пярвічкі БРСМ навучальнай установы Аляксандр Бубыраў вось ужо колькі часу спрабуе адшукаць гаспадара для сучкі, якая больш за месяц таму пасялілася ў дварэ іх шматкватэрнага дома.

— Яна вельмі добрая, ні на кога не брэша. Усе жыльцы падкормліваюць «знайдыша», асабліва любяць жывёлу дзеці. Тым больш што ў яе неўзабаве павінны з'явіцца шчанюкі, — расказаў нам Саша. — Стала шкада яе, таму размясціў аб'яву аб пошуку гаспадара для сабакі ў групе «Дапамога жывёлам Слуцка» ў сацыяльнай сетцы «УКантакце». На жаль, пакуль намаганні плёну не прынеслі...

Як прызнаецца Аляксандр, ён сам любіць сабак і ўзяў бы беспрытульную жывёліну дадому. Тым больш што і бацькі, напэўна, не моцна пярэчылі б. Але там ужо жыве такса Цім, а для кватэры дзве жывёлы — гэта ўжо мнагавата...

ГОЛАС ВЕТЭРАНА ДЛЯ ГІСТОРЫІ

Яго на дыктафон для фанатэкі музея Вялікай Айчыннай вайны «Не сціхае наша памяць» калінкавіцкай СШ №2 разам з загадчыцай Аленай Уладзіміраўнай Рудзеняй запісалі Марыя Захарчанка і Яна Драздова — валанцёры пярвічкі БРСМ навучальнай установы.

— Тамільяр Гільміяравіч Мендзіяраў выхоўваўся ў дзіцячым доме ў Башкірыі. Калі пачалася вайна, пайшоў на фронт у няпоўныя 18 гадоў, ваяваў мінамётчыкам, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Заходняй Украіны, Румыніі, Венгрыі, Чэхіі, — расказала другі сакратар Калінкавіцкага раённага камітэта БРСМ, куратар пярвічак навучальных устаноў Валянціна Яўгенаўна Дронік. — Ветэран узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне». Валанцёры пачулі пра баявыя подзвігі франтавіка і запісалі гэтыя ўспаміны. Як аднойчы, у выніку раптоўнага нападзення ворага, загінулі ўсе яго баявыя таварышы, сам ён быў паранены, але паспеў развярнуць зброю ў бок праціўніка. Як іншым разам малады баец выратаваў склад боепрыпасаў, які мог загарэцца ад абстрэлу немцамі...

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

З пошты ЧЫРВОНКІ ЧЗ

Кіно або кніга? Выбар за вамі

Ганна КУРТАСАВА,
вучаніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска:

«Вядома, у кожнага з нас знойдуцца свае аргументы на карысць кнігі ці кіно.

Пры праглядзе фільма на гледача ідзе прамое ўздзеянне з экрана. Пры чытанні ж кнігі мы самі ствараем вобразы герояў, уяўляем сабе іх знешнасць і характар. Кіно адрозніваецца ад кніг тым, што часам мы бачым на экране зусім не тое, чаго чакалі і хацелі ўбачыць. Адрозніваюцца ад нашага ўяўлення вобразы герояў. Рэжысёры фільмаў скарачаюць сюжэт, напісаны паводле кнігі, не ўключаючы ў яго мноства важных і цікавых момантаў, а выкарыстоўваюць толькі ключавыя. Могуць быць прапушчаны тыя сцэны, якія мы хацелі ўбачыць не толькі ў сваім уяўленні, але і на экране. Акцёры могуць сыграць не так эмацыянальна і рэалістычна, як мы адчувалі, чытаючы кнігу. З іншага боку, уваходзячы ў свет кінематографа, чалавек усё больш захапляецца візуальнымі эфектамі і перастае звяртаць увагу на змест.

І кіно, і кніга маюць свае перавагі, аднак апошняя, я лічу, больш карысная і неабходная чалавеку. Роля фільмаў вялікая ў выпадках хуткага і масавага ўздзеяння на чалавека. Хоць такое ўздзеянне не заўсёды адыгрывае станоўчую ролю. Адным словам, выбар заўсёды застаецца за вамі...»

Адчуйце сябе беларусамі!

Настасся МАСЛОЎСКАЯ,
вучаніца 11 класа гімназіі №16 г. Мінска:

«Беларускай мовай сёння карыстаюцца не толькі настаўнікі, літаратары ды лінгвісты, але і людзі самых розных прафесій, якія размаўляюць на ёй кожны дзень — дома, на вучобе, на працы. Настаўніца па танцах і навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Вераніка Акудовіч з'яўляецца адной з такіх «папулярызатарак» роднай мовы і культуры.

Яна кажа, што па-беларуску пачала размаўляць з трынаццаці гадоў, калі паехала ў Чэхію на адпачынак. Менавіта там паўстала пытанне самаідэнтыфікацыі, таму што навакольныя з-за рускай мовы атаясамлівалі групу з грамадзянамі Расіі. «Але ж я беларуска! У той момант стала абсалютна відавочна, што мова — самы яскравы індыкатар нацыі, тое, праз што цябе могуць ідэнтыфікаваць іншыя. Па вяртанні на радзіму гэтае адчуванне засталося, таму паступова я стала пераходзіць на беларускую мову, спачатку ў сям'і і з самымі блізкімі сябрамі, а потым паступова і ўвогуле стала беларускамоўным моналінгвам».

Суразмоўца кажа, што вучылася гаварыць на роднай мове ў першую чаргу ў сям'і, паколькі ад таты чула яе з самага маленства. «Апроч таго, у мяне была школа, у якой усе прадметы выкладаліся па-беларуску, і цалкам беларускамоўны ліцэй (адтуль, дарэчы, амаль усе мае беларускамоўныя сябры). У ліцэі быў вельмі моцны курс беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, ды і ўвогуле ўсе прадметы выкладаліся на мове выдатнымі настаўнікамі. Так што падмурак быў закладзены яшчэ ў дзяцінстве, і трэба было толькі моцна захацець».

Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ПЕРАКАНАЦЬ СЛОВАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Найбольш складаны турнір за час маёй дэбацкай кар'еры быў у Славакіі, — гаворыць Уладзіслава. — Тэма была сфарміраваная наступным чынам: «Этнічныя меншасці, чые правы не парушаюцца, не абавязкова павінны ствараць сваю дзяржаву». Гэта быў мой першы выязны турнір. Прыйшлося шмат рыхтавацца, чытаць палітычныя артыкулы. Было вельмі цяжка, але, нягледзячы на гэта, мы ўзялі трэцяе месца. На гэтым жа турніры ў якасці непадрыхтаванай прапанавалі тэму «Нацыянальныя спартыўныя зборныя не павінны прымаць іншаземцаў». Калі б мы зусім не цікавіліся навінамі на гэтую тэму, перамагчы было б немагчыма. Але ў нашай камандзе кожны нешта ведаў аб розных відах спорту, і за паўгадзіны мы змаглі падрыхтаваць добрыя аргументы.

Пасля кожнага выступоўцы ёсць невялічкі раўнд для пытанняў-адказаў. А потым гучыць прамова апанентаў. Рэагаваць трэба хутка. Суддзі ацэньваюць аргументаванасць, падачу і якасць гаворкі. Часу на напісанне тэксту няма, таму трэба быць сканцэнтраваным і не губляць ніці паведамлення.

— Дэбаты — гэта бясцэнны вопыт. Яны вучаць думаць у крытычных сітуацыях. Часта такія навыкі патрэбныя і на звычайных школьных занятках. Напрыклад, калі трэба напісаць эсэ па нейкім філасофскім пытанні па грамадазнаўстве. А ў жыцці дэбацкія навыкі дапамагаюць аргументавана перамагаць у спрэчках. Наогул, трэба пратрымацца толькі трое заняткаў, пакуль не асвоішся, а потым ужо сысці немагчыма. Тут

Беларусы на чэмпіянаце ў Рызе.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

абсалютна не мае значэння твой сярэдні бал у школе ці адзнакі. На дэбатах раскрываецца менавіта інтэлект, які сфарміраваны ведамі і жыццёвым досведам. Напрыклад, адразу відаць, хто сочыць за навінамі, а хто не. Дэбацёр у залежнасці ад тэмы павінен быць і навукоўцам, і інжынерам, і эканамістам — валодаць інфармацыяй з самых розных сфер. Гэта неверагоднае пашырэнне кругагляду.

У Беларусі ёсць некалькі вельмі моцных дэбатных клубаў. У Мінску, у першую чаргу, гэта клубы гімназіі №7 і Мінскага Палаца моладзі пад кіраўніцтвам Алены Стэфановіч. На базе гімназіі восенню штогод праходзіць міжнародны турнір. Апошнім разам ён сабраў каля 40 каманд з розных краін. Традыцыйна на яго прыязджаюць дэлегацыі з Расіі. Прычым, не толькі з Масквы і Санкт-Пецярбурга... Ужо не першы год наведваюць Мінск школьнікі з Якуціі. У розны час турнір прымаў таксама гасцей з Латвіі, Літвы, Украіны, Германіі і Чэхіі.

— І нашы каманды часта запрашаюць за мяжу, — адзначае Алена Стэфановіч. — Апошнія тры гады мы наведваем міжнародны веснавы турнір у Рызе. Сёлета ў цэнтры ўвагі будзе іміграцыя ў Еўропе. У Беларусі спаборніцтвы праходзяць кожны сезон. Восенню — міжнародныя ў Мінску, узімку — рэспубліканскія. На апошнія беларускія каманды збіраюцца ў адным з рэгіянальных гарадоў. Напрыклад, сёлета яго прымаў Барысаў. Таксама ў лютым адбываецца конкурс «Спікер года», у якім кожны з дэбацёраў можа сябе паказаць у індывідуальным спаборніцтве. Ён праходзіць у два этапы: падрыхтаваны літаратурны ўрывак і спантанная прамова на прапанаваную тэму. Увесну таксама праходзіць рэспубліканскі турнір у Мінску, але на яго часта прыязджаюць і каманды з Расіі. А летам Мінскі Палац моладзі ладзіць сваё гарадское спаборніцтва.

У абласцях Беларусі трэніруюцца не менш моцныя каманды: віцебскай гімназіі №8 (кіраўнік Марыя Ашчэпкава), баранавіцкай гімназіі №1 (Валянціна Ляўчук), барысаўскага ліцэя (Франчэска Радыёнава). Дэбатны клуб гродзенскай гімназіі №1 пад кіраўніцтвам Міхаіла Фрыдмана заўсёды выстаўляе моцныя англамоўныя каманды. Увогуле на турнірах ёсць магчымасць гуляць на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. Але чым больш прафесійна выступаеш, тым больш патрэбна валоданне замежнай. Гэта дае магчымасць выязджаць на міжнародныя турніры. Выступаюць беларусы і на штогадовым Чэмпіянаце Еўропы ў Чэхіі. Гэтым летам дэбацёры з усяго свету будуць абмяркоўваць найбольш хвалюючыя тэмы: міграцыю і правы меншасцяў.

Надзея АНІСОВІЧ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Медыяпрастора

Пагуляць... у журналісцкае расследаванне

«Зімовая школа студэнцкай журналістыкі» пройдзе на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна» з 4 па 6 сакавіка. У міжнародным семінары-практыкуме возьмуць удзел 25 устаноў адукацыі (225 студэнтаў, спецыялістаў па рабоце з моладдзю і прадстаўнікоў універсітэцкіх прэс-службаў), а таксама госці з Азербайджана, Арменіі, Германіі, Украіны, Расіі і Славакіі.

Праграма «Зімовай школы» ўключае правядзенне адукацыйных семінараў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Інстытута журналістыкі БДУ, выстаўкі студэнцкіх газет, трэнінгі па камандаўтварэнні, майстар-класы ад прадстаўнікоў беларускіх СМІ. Студэнтаў запросяць паўдзельнічаць у тэматычнай гульні «Што? Дзе? Калі?» і ролевай гульні «Журналісцкае расследаванне». У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў семінараў акажуцца наступныя тэмы: «Студэнцкая газета: пошук новай формы і зместу», «Эфектыўная фатаграфія: сакрэты поспеху», «Студэнцкія СМІ ў інтэрнэце», «Дызайн газеты», « PRасвета», «Сацыяльныя сеткі як новая рэчаіснасць журналістыкі», «Эфектыўныя тэхналогіі стварэння актуальнага медыякантэнту» і іншыя.

Таксама адбудзецца брыфінг кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь са студэнцкім актывам.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

СЛУХАЙЦЕ СВОЙ АРГАНІЗМ

ЧАМУ ДЫЕТЫ ДОЎГА НЕ ПРАЦУЮЦЬ

Памятаю, на курсах для фітнес-інструктараў нам чыталі лекцыю па правільным харчаванні. Ужо было гадзін восем вечара, калі зграбная жанчына за 50 расказвала нам пра тое, што трэба пазбягаць смажанага, есці дробнымі порцыямі і, увогуле, наша сённяшняя вячэра мусіла адбыцца гадзіну таму. Апошняе сцвярджэнне падтрымкі ў будучых трэнераў не знайшло. Бо, калі хочацца есці, не ісці ж спаць галоднымі! Я, напрыклад, гадзін у 10 звычайна вячэраю (але кліенткам пра гэта не расказваю).

Калі шчыра, то я не люблю правілаў. Няма сярод іх такіх, якія былі б аднолькава добрымі для ўсіх. Дый самі навукоўцы «блытаюцца ў паказаннях». Напрыклад, ці можна есці пасля вячэрняй трэніроўкі? Многія дзяўчаты ўпэўнены, што не. П'юць перад сном гарбату ўпрыкуску з грэйпфрутам, каб не сарвацца на катлеты. І яшчэ шмат да якіх хітрыкаў звяртаюцца, каб падмануць голад (а я ўпэўнена, што гэта сапраўды ён, бо падчас заняткаў вы траціце шмат энергіі). А ёсць погляд, што ўсе гэтыя ахвяры дарэмныя. Занадта доўгі перапынак паміж прыёмамі ежы вымушае арганізм пераключыцца ў рэжым «выжывання» і яшчэ менш ахвотна губляць лішнія кілаграмы.

Гэты ж рэжым уключаецца, калі рэзка абмяжоўваеш сябе ў харчаванні. Праўда, тут яшчэ і псіхалагічны фактар спрацоўвае. Самі разумееце, як хочацца забароненага. Калі ў падлеткавым узросце вучылася трымаць сябе ў руках (а хто з дзяўчат у гэты перыяд задаволены сваёй знешнасцю?), думкі былі толькі пра шакалад і блінцы са смятанай. Адразу скажу — усе мае спробы тады скончыліся правалам. Таму цяпер, калі хтосьці з дзяўчат цікавіцца, як пахудзець, ніколі не раю цалкам адмаўляцца ад нейкіх прадуктаў.

Ці вось яшчэ адно распаўсюджанае правіла — піць каву і гарбату без цукру. Відаць, іспанскім нейрапсіхолагам яно вельмі не спадабалася, бо яны даказалі адваротнае. На думку навукоўцаў, у каве без цукру ніякай карысці. «Магія» адбываецца толькі пры камбінацыі глюкозы і кафеіну. Менавіта падсалоджаны напой павышае актыўнасць аддзелаў мозга, якія адказваюць за памяць і канцэнтрацыю. І аднаўляе мышцы пасля інтэнсіўных трэніровак. Ну і каму верыць?

Ведаеце, як хутка стаць папулярным? Распрацуйце сваю дыету. Колькі іх ужо было — крамлёўская, шакаладная, кефірная, па групе крыві — і кожная знаходзіла безліч прыхільнікаў. Нават самая абсурдная. Пра тлушчавую дыету не чулі? Польскі ўрач, які яе прапанаваў, запэўніваў: каб пахудзець, трэба налягаць на тлушчы! Таму ў рацыёне абавязкова мусіць быць мяса, сала, бекон, смятана. І ніякай табе гародніны, аўсянкі і вотруб'я. Гэта ж мара! Адзін толькі мінус (а, дакладней, два): удар па печані і непрыемны пах ацэтону ад цела.

Дарэчы, пра сала. Здавалася б, шкодна і кропка. Але вось вам прыклад з жыцця. Мая мама — тэрапеўт, між іншым — аматарка сала. Бярэ яго з сабой на працу ў якасці перакусу. Халестэрын у норме. У той жа час некаторыя дыетычныя прадукты не такія карысныя, як прынята думаць. Той жа абястлушчаны тварог, які нахвальваюць дыеты, горш засвойваецца і змяшчае больш хімічных дабавак (трэба ж захаваць смак). Затое варыянт з дзевяццю працэнтамі тлушчу лічыцца ідэальным.

Увогуле, я за тое, каб ежа прыносіла задавальненне. Чаму дыеты доўга не працуюць? Таму што ўсе гэтыя сняданкі па раскладзе, порцыі па 95 грамаў і брокалі, якую раяць жаваць у любой сітуацыі (хоць яна насамрэч смачная!), не радуюць. Па тэлевізары цяпер рэкламуюць сістэму харчавання ад вядомай тэлевядучай. Прадаюць каробачкі з наборам страў на тыдзень і абяцаюць: гэтае меню дапаможа вам пахудзець. Па-першае, істотна пазбавіцца ад тлушчу за такі кароткі прамежак часу вы не паспееце. Па-другое... Вы ж разумееце, якіх бы памераў была каробка, калі б у яе наклалі звычайных прадуктаў на 28 прыёмаў ежы? Таму кожная страва ў наборы — у выглядзе сухога парашку. Сумняваюся, што можна доўга пратрымацца на гэтых непрывабных разведзеных сумесях, няхай яны і дастаткова сытныя. Хоць само меню варта ўзяць на заметку.

Мне здаецца, харчаванне мусіць быць інтуітыўным (не, калі вам пастаянна хочацца булак — гэта не інтуіцыя). Арганізм сам разумее, калі і што трэба з'есці. Чым шукаць чарговую дыету, варта прыслухацца да сябе. Навучыцца адрозніваць голад ад нуды. Своечасова ўставаць з-за стала. Есці, не спяшаючыся, бо пачуццё сытасці прыйдзе толькі праз хвілін пятнаццаць. Не запіваць торт гарбатай, так меней улезе. Згодна, зноў мы аб правілах. Але, заўважце, яны вас не абмяжоўваюць. Таму і прытрымлівацца іх куды прасцей. Пайду паем...

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 03 2016 г.

Пакаленне гаджэтаў

ВЫХАПІЦЬ З ПАВУЦІННЯ

Дзе шукаць прышчэпку ад залежнасці

Сёння інтэрнэтзалежнасць параўноўваюць з прыхільнасцю да алкаголю ці наркотыкаў. Псіхалагічныя механізмы падобныя, але адсутнічае хімічны складнік. Таму не рэдкія выпадкі, калі дарослыя, якія вылечваюцца ад алкагольнай залежнасці, пераключаюцца на сеціва. Праблема яшчэ і ў тым, што спіртныя напоі нікому з бацькоў і ў галаву не прыйдзе прапаноўваць дзецям, а гаджэты падсунуць нават маленькаму дзіцяці, каб проста яго заняць ці супакоіць. І хоць вывучаць уплыў камп'ютара на псіхіку чалавека пачалі яшчэ ў 1980-я гады, такога дыягназу, як інтэрнэтзалежнасць, і па цяперашні дзень не існуе.

— Калі вашы блізкія завязлі ў сеціве, іх паводзіны, як лакмусавая паперка, якая паказвае, што чалавеку, яго сям'і патрэбна дапамога, — заўважае **псіхолаг Гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіна СТАНЧЫК.** — Як правіла, дзеці сыходзяць у віртуальны свет, калі адчуваюць псіхалагічны дыскамфорт, маюць праблемы з роднымі, сябрамі. Для іх гэта спосаб зняцця трывогі, стрэсу, у тым ліку бегства ад павучанняў і — увага (!) — ведаў. «Патупіць» каля манітора для многіх дзяцей — гэта проста жаданне адпачыць ад інфармацыі, якой іх загружаюць.

І, што цікава, у выніку некаторых даследаванняў псіхолагі заўважылі, што ў падлеткаў, якія рана пазнаёміліся з інтэрнэтам, з узростам гэта захапленне значна зніжаецца, больш схільныя да залежнасці людзі, якія пачалі асвойвацца ў сеціве ў больш сталым узросце.

Можна шмат казаць пра шкоду залішняга завісання ў віртуале. Статычная нагрузка, калі чалавек падоўгу праседжвае ў манітора, не на карысць пазваночніку, праблемы са зрокам, галаўны боль.

Звяртацца па дапамогу спецыяліста неабходна, калі вы бачыце, што «губляеце» сваіх дзяцей — яны перастаюць з вамі размаўляць, становяцца раздражнёнымі, агрэсіўнымі, неахайнымі. Хлопчыкі і дзяўчынкі не цікавяцца нічым, акрамя камп'ютара, не сустракаюцца з равеснікамі, адмаўляюцца ад забаў, якія ім раней падабаліся, забываюць пра хатнія справы, не робяць урокі і нават ядуць за «кампом». Сустракаюцца і такія, што з-за камп'ютарных гульняў прапускаюць школу.

— Інфармацыйная перагрузка ўяўляе сур'ёзную рызыку для здароўя, — папярэджвае Галіна Станчык. — Мозг, калі ён нечым захоплены, не заўважае фізіялагічных патрэб. У людзей ствараецца ўяўленне, што яны хутка атрымаюць задавальненне. Яны бясконца правяраюць пошту, думаюць, што наступны ліст, ролік на «ютубе» будзе класным. Гэта знясільвае фізічна. Карыстальнікі сеціва, асабліва юныя, могуць не адчуваць голаду і стомленасці.

— Праўда, ёсць даследаванні, якія даказваюць, што «стралялкі» не такія ўжо і шкодныя і нават дапамагаюць здымаць напружанне, пазбаўляцца ад трывогі. Для падлеткаў і дарослых больш шкодныя гульні ролевыя, калі ёсць рызыка, што яны сыдуць у іншыя светы, перастануць адрозніваць рэчаіснасць ад віртуальнага жыцця.

Псіхолагі не раяць прапаноўваць камп'ютары дзецям да пяці гадоў — гэта будзе лепшай прафілактыкай інтэрнэтзалежнасці.

Канешне, бацькам зручна, каб супакоіць дзіця, прапанаваць яму гаджэт, але для малых гэта шкодна. Дзеці, якія не нагуляліся з равеснікамі ці бацькамі, могуць сутыкнуцца з праблемамі ў школе. Яны плачуць, калі ў іх нешта не атрымліваецца, таму што не навучыліся прайграваць, бо калі штосьці пайшло не так у камп'ютарнай гульні, яе можна проста перазагрузіць.

— Сучасным дзецям не даюць пасумаваць. А сум — як і іншыя пачуцці — вельмі карысны, дзіця вучыцца пераадольваць яго, разумець свае жаданні, — заўважае Галіна Станчык.— Таму школьны сум для малых часта невыносны. Вось і дастаюць дзеці мабільныя тэлефоны на ўроках, бо не ведаюць, як ім інакш справіцца са сваім дыскамфортам.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вяртанне ў рэальнасць пачынаецца з наладжвання ўзаемаадносін у сям'і.

І калі бацькі не могуць выйсці на кантакт са сваім дзіцем, лепшая парада — паспрабаваць усё наладзіць пры дапамозе... гаджэтаў. Варта толькі папрасіць, каб сын ці дачка навучылі вас розным камп'ютарным хітрыкам.

— Калі дзяцей вучаць плаваць, яны першы час знаходзяцца пад кантролем дарослых. Прыкладна так павінна быць і з камп'ютарам, — заўважае Галіна Станчык. — Бацькам трэба сачыць, каб сыны і дочкі не «патанулі» ў сеціве, адпусціць у «вольнае плаванне» можна толькі тады, калі дзеці будуць упэўнена прытрымлівацца правіл бяспекі (вельмі важна «за буйкі не заплываць»). Можна дамаўляцца, каб яны па таймеры выключалі камп'ютар альбо прытрымліваліся ўстаноўленых правіл: сёння засядзеліся за гаджэтамі — на наступны дзень не змогуць імі карыстацца.

Наўрад ці нечага можна дасягнуць поўнай забаронай карыстацца гаджэтамі. Наадварот, так вы толькі будзеце падагравать цікаўнасць, бо забаронены плод заўсёды саладзейшы. Ды і прапанаваць віртуальныя сеансы як узнагароду, напэўна, не варта. Псіхолагі спрабавалі і такі спосаб уздзеяння, як навязванне падлеткам камп'ютара, прымушалі сядзець за ім па 5-6 гадзін і заўважылі, што, калі ў дзіцяці былі іншыя, не віртуальныя інтарэсы, яно праз некаторы час усё роўна да іх вярталася. Напэўна, кожная сям'я зможа выпрацаваць нейкую сваю стратэгію, але галоўнае, каб дзецям было ўтульна ў рэальным свеце. І новыя інтарэсы, захапленні, знаёмствы дапамогуць выцягнуць дзіця з павуціння. Сёння складана ўявіць жыццё без інтэрнэту, схаваць ці забараніць яго немагчыма, але, як да любой новай культуры, да яго трэба прызвычайвацца і вучыцца правільна ім карыстацца.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Шанц ёсць!

Дай, сябра, лапу на шчасце

Выраз «мы ў адказе за тых, каго прыручылі» ведаюць усе. Але тым не менш кожны год тысячы жывёл аказваюцца на вуліцы. Шчаня вырастае і становіцца не такім пацешным, а кот дзярэ шпалеры пасля рамонту... Нават такія несур'ёзныя прычыны з'яўляюцца нагодай, каб выкінуць нядаўняга сябра на вуліцу. На шчасце, ёсць тыя, каму не абыякавы лёс братоў нашых меншых. Студэнтка пятага курса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Аніcся ПРАЦЭНКА ўжо амаль год займаецца валанцёрствам у дабрачыннай арганізацыі «ЗААшанц».

Зараз больш за сотню валанцёраў даглядаюць амаль 500 жывёл. Яны іх лечаць, даюць часовы прытулак, рэкламуюць у сацыяльных сетках. Дарэчы, менавіта ў інтэрнэце часцей за ўсё знаходзіцца неабходная дапамога. У самой Аніссі зараз дома жыве сем катоў: пяцёра сваіх і два на ператрымцы ў чаканні новых гаспадароў. Займацца валанцёрствам яна пачала з падачы сяброўкі: вырашыла ёй дапамагчы, а потым і сама ўцягнулася.

— Жывёлы трапляюць да нас парознаму, — распавядае Аніcся. — Часцей за ўсё валанцёры знаходзяць іх у сваіх дварах. Бываюць і экстранныя выпадкі. Для гэтага ў нас ёсць тэлефон, па якім кожны можа звярнуцца. Пастараемся тэрмінова прыехаць і дапамагчы. Усе жывёлы, якіх прапаноўваем, здаровыя. Мы з імі, перш за ўсё, звяртаемся ў ветклінікі, лечым, калі патрэбна. Напрыклад, нядаўна жанчына знайшла ў Бараўлянах кошку з прабітай галавой. Верагодна, яе збіла машына. Мы паспелі выратаваць жывёліну. Зараз яна яшчэ лечыцца, але ўжо самастойна пачала есці, ідзе на папраўку.

Не ўсім жывёлам шчасціць хутка знайсці новы дом. Нямецкая аўчарка Кіра жыве ў валанцёраў ужо два гады. Забралі яе ў нядбайнай гаспадыні: тая ўжо махнула на сабаку рукой і збіралася ўсыпляць. Калі Кіра трапіла ў «ЗААшанц», яна была амаль голая, без шэрсці. Але за два гады ператварылася ў вельмі ладную жывёліну. На жаль, на гэтым яе прыгоды не скончыліся. Сабаку забрала новая гаспадыня, але па невядомых прычынах праз некаторы час Кіру знайшлі прывязанай на вуліцы... Зараз яе патрэбна зноў падлечваць. Жывёліна не пераносіць холад, таму валанцёры пашылі ёй цёплы камбінезон і шукаюць новых гаспадароў.

— У халодную пару жывёлам даводзіцца вельмі цяжка. Большасць падвалаў закалочваюць, і катам нават няма дзе схавацца. Часам іх падбіраюць, але гэта таксама не заўсёды правільна. Некаторыя бяруць шмат жывёл з вуліцы з-за жалю, але потым не кантралююць іх. Катоў і сабак становіцца так шмат, што гаспадары не могуць за імі належным чынам наглядаць. Мы называем такія кватэры «стыхійнікамі». Некаторы час таму наш валанцёр Анастасія разбіралася ў сітуацыі з адной бабуляй. У яе гаражы жыло 23 сабакі, 13 шчанят і 13 катоў! Сабакам не было чаго есці. Там была такая бойка за жыццё! За год яна прыстроіла амаль усіх.

Валанцёры вельмі ўважліва падыходзяць да пошуку новых гаспадароў. На сайце ёсць каталог з фатаграфіямі жывёл. Звычайна, калі хтосьці спадабаўся, чалавек тэлефануе. Валанцёры размаўляюць з ім, потым арганізуюць «агледзіны»: запрашаюць пазнаёміцца з будучым гадаванцам. Калі ўсё праходзіць добра, яны самі вязуць яго ў новы дом, каб быць упэўненымі, што ў іх падапечнага ўсё будзе добра. З гаспадаром яны заключаюць дагавор, па якім у сітуацыі, калі, напрыклад, высветляцца нечаканыя абставіны, валанцёры могуць забраць ката ці сабаку. Часам здараецца, што жывёліна падчас ператрымкі паводзіць сябе адным чынам, а ў новай сям'і — па-іншаму. У гэтым выпадку валанцёры таксама могуць яго забраць па просьбе гаспадароў.

— У нас ёсць «чорны спіс», куды трапляюць людзі, якім нельга аддаваць жывёл. Напрыклад, быў выпадак, калі патэлефанаваў мужчына і спытаў гладкашэрснае кацяня. Калі валанцёр пацікавіўся, чым не падыходзяць пухнатыя, ён адказаў: «Каб пітон не падавіўся». Натуральна, што мы яму нікога не аддалі. Яшчэ перад тым, як прывезці жывёлін, просім, каб гаспадары падрыхтавалі сваю кватэру. Адно з патрабаванняў — маскітныя сеткі на вокнах са шклопакетамі, бо маленькія кацяняты часам залазяць паміж імі і ламаюць сабе спіны. Яшчэ ёсць тыя, хто адчыняе вокны насцеж, а потым каты падаюць з вышыні. Мы спрабуем прадухіліць такія сітуацыі.

Кіра два гады таму.

Не пазналі? Гэта Кіра зараз.

Часам да нас трапляюць і зусім дзікія жывёлы. Калі кошка з дзяцінства жыве на вуліцы, яна не заўсёды можа адаптавацца ў чалавечым жыллі. Калі бачым, што жывёліна ні за што не прыжывецца, абавязкова аказваем медыцынскую дапамогу, стэрылізуем і адпускаем на волю.

Дзіўна, але часцей за ўсё новае жыллё знаходзяць каты рыжай і белай афарбоўкі. Каб усіх уладкаваць, валанцёрам патрэбна розная дапамога. Прытуліць каго-небудзь на нейкі час, падвезці жывёлу да ветлячэбніцы, раздаць лістоўкі ці нават сфатаграфаваць і распаўсюдзіць здымкі ў сацыяльных сетках — гэта крокі, якія дапамагаюць у пошуку новых гаспадароў. Але нават калі вы, вяртаючыся дадому, не пройдзеце міма дваровай кошкі і падзеліцеся з ёю сасіскай, то, магчыма, выратуеце яе жыццё.

Надзея АНІСОВІЧ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Небяспечны партал

ЗАВІСНУЦЬ... НА ТРЫ ГАДЗІНЫ

Як сведчаць звесткі сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам у кастрычніку—лістападзе мінулага года, больш як 87% беларускіх юзераў звяртаюцца да інтэрнэта штодня. А кожны дзясяты выкарыстоўвае яго магчымасці раз на тыдзень.

Сярод непаўналетніх жыхароў краіны з інтэрнэтам сябруюць 64%. Каля 85,5% рэспандэнтаў, якія карыстаюцца інтэрнэтам штодня, праводзяць там больш за гадзіну ў дзень, у тым ліку 49% — ад адной да трох гадзін і 36,5% — «завісаюць» у віртуальным свеце больш як на тры гадзіны. Менш за гадзіну ў суткі выдаткоўвае на віртуальную рэчаіснасць толькі дзясятая частка апытаных (11%).

Больш як палавіна карыстальнікаў (59%) заявілі, што звяртаюцца да глабальнай сеткі па-за межамі дома, з дапамогай мабільных устройстваў, тэлефона, планшэта і ноўтбука з 3G-мадэмам. Пры гэтым сярод моладзі ва ўзросце ад 16 да 29 гадоў доля карыстальнікаў мабільнага інтэрнэту складае 77,5 працэнта. І 85% рэспандэнтаў паведамілі, што маюць па месцы жыхарства фіксаванае падключэнне да інтэрнэту.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Юным наведнікам прыйшоўся даспадобы веласіпед музыканта.

Пашыраючы прастору

РОВАРЫ «З ДУШОЙ»

Як «паставіць на колы» цэлы касцёл?

Ці можа звычайны веласіпед быць яшчэ і прафесійным інструментам? Так, вядома, і цяпер вясковыя паштальёны карыстаюцца гэтым відам транспарту для працоўных патрэб, але, акрамя такога прыкладу, у галаву адразу нічога і не прыходзіць. Але ж яшчэ стагоддзе таму «двухколавыя» былі незаменным атрыбутам пажарных, святароў, медыкаў, цырульнікаў, пчаляроў і нават музыкантаў. Нядаўна ў Нацыянальным гістарычным музеі распачаўся міжнародны выставачны праект «Усё жыццё ў адным ровары», наведнікі якога могуць пабачыць рарытэтныя «прафесійныя» веласіпеды.

— Задума нашай выставы нарадзілася ў Італіі, — расказвае яе **куратар Інга РЫЧЫ.** — Пасля наведвання музея ў малюсенькім горадзе Мантэльпарэ, дзе выстаўляліся самыя розныя атрыбуты жыцця працоўнага класа, у тым ліку веласіпеды, мяне азарыла, што можна было б зрабіць выставу, прысвечаную менавіта ім. Пасля гэтага давялося пазнаёміцца з Маўрыцыа Урбінаці — прафесійным пекарам і вядомым прыватным калекцыянерам роваряў.

У калекцыі італьянца, якая каля 40 гадоў таму пачалася з веласіпеда каваля, цяпер дзясяткі самых розных двухколавых машын. У Мінск прыехала невялікая частка — 30 экспанатаў. Сярод іх толькі два маюць неітальянскае «паходжанне»: транспарт лонданскага пажарнага і швейцарскі салдацкі ровар. Дарэчы, усе яны «на хаду». Як сцвярджаюць арганізатары, кожны веласіпед — абсалютна арыгінальны, ніводная дэталь не была заменена на сучасную. Тое самае датычыцца і прафесійных артэфактаў. Калі на ровары берсальера (стралка італьянскага войска) вы бачыце капялюш з пер'ем фазана (для абароны шыі ад удару шабляй), гэта сапраўдны стагадовы галаўны ўбор. Дарэчы, гэта самы стары экспанат. А самаму маладому — транспартнаму сродку клоўна — 60 гадоў.

— Ровары ілюструюць жыццё мужчын у пачатку і сярэдзіне мінулага стагоддзя, — кажа Інга Рычы. — У Італіі жанчына звычайна займаецца хатнімі справамі, а грошы зарабляе мужчына. Менавіта веласіпеды сталі тым інструментам, які дазволіў італьянцам перамяшчацца на вялікую адлегласць і выконваць большыя аб'ёмы працы. Акрамя таго, экспанаты дапамагаюць скласці ўражанне пра фізічную моц тых людзей: мы нядаўна падымалі адзін з роваряў па лесвіцы ў тэлестудыю, і тры дарослыя мужчыны ледзь справіліся, бо тэхніка таго часу была вельмі масіўнай.

Некаторыя экспанаты — гэта яшчэ і цуд інжынернай думкі. Так, скажам, веласіпед краўца аснашчаны швейнай машынай, якая працуе ад кручэння педаляў. Ёсць тут і матарызаваныя транспартныя сродкі. Варта яшчэ сказаць, што асобныя веласіпеды дазваляюць даведацца больш аб прафесіях, якіх ужо нават і не існуе.

Разглядаем экспанаты. Некаторыя выглядаюць вельмі падманліва. Скажам, веласіпед з «жаночай» рамай далёка не абавязкова належаў прадстаўніцы слабай паловы чалавецтва. Прыклад — ровар каталіцкага святара, доўгая раса якога не павінна была замінаць руху. Ад «зажоўвання» спецыяльным кажухом абаронены і ланцуг. Звычайна такім сродкам карысталіся тыя служкі культу, паства якіх жыла ў вёсках. З сабой святары ў спецыяльнай прымацаванай скрыні перавозілі ўсе атрыбуты алтара. Святая вада, крыж, Святое Пісанне — усё гэта станавілася своеасаблівай мабільнай царквой дзякуючы італьянскім роварам.

У той жа час памылкай будзе думаць, што ўсе веласіпеды выключна мужчынскія. Жанчыны таксама зараблялі на хлеб пры дапамозе веласіпедаў, няхай сабе і не так масава, як мужчыны. Прыклад — прафесія матэрасая (materassaio), або матрацніка. Такія працаўніцы накіроўваліся ў пасёлкі і гучна абвяшчалі аб сваім прыбыцці. Жыхары прыносілі на плошчу спальныя матрацы, з якіх майстар даставаў баваўняны напаўняльнік, распарваючы насыпку. Пасля гэтага на спецыяльным узбівальніку, якім быў аснашчаны ровар, баваўна ачышчалася ад бруду і засыпалася ў новую абалонку.

Фота Надзеі БУЖАН.

Самы малады з экспанатаў — ровар «у кедах», які належаў клоўну.

Ёсць на выставе і экспанаты, звязаныя з дзецьмі. Скажам, да рамы веласіпеда камінара прымацавана невялікае дадатковае сядзенне. Гэта цікавае сведчанне выкарыстання дзіцячай працы. Праўда, як кажуць арганізатары, для хлопчыкаў тых часоў працаваць было вялікім гонарам. Вось і ездзілі разам з дарослымі іх маленькія памагатыя, якія маглі спускацца ў самыя вузкія коміны.

Веласіпеды будуць дэманстраваць на працягу цэлага года ва ўсіх абласных цэнтрах краіны, акрамя Брэста. Таму аматарам гісторыі далёка ехаць не прыйдзецца — варта толькі сачыць за афішамі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Дакрануцца да гісторыі

СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ, або Ад галубоў — да мабільніка

З канца мінулага года ў нашай краіне з'явілася сувязь чацвёртага пакалення, так званая 4G або LTE. Цяпер інтэрнэт у мабільных прыладах павінен стаць хутчэйшым у дзясяткі разоў, што, як мяркуюць некаторыя спецыялісты, у перспектыве дазволіць увогуле адмовіцца ад сотавай сувязі... Магчыма, ужо праз некалькі гадоў апараты, якімі мы карыстаемся, апынуцца ў гісторыка-інфармацыйным цэнтры РУП «Белтэлекам» — месцы, дзе захоўваюцца шматлікія сведчанні «безінтэрнэтных» часоў. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі музей сувязі і даведаліся больш аб тым, як беларусы абменьваліся інфармацыяй у «аналагавую» эпоху і чаму славутымі «барышнямі» маглі быць толькі незамужнія.

Разам з загадчыкам гісторыка-інфармацыйнага цэнтра Тамарай САЛОМКАЙ абыходзім выставу ў храналагічным парадку.

Загадчык музея Тамара Саломка, здаецца, ведае пра гісторыю сувязі ў Беларусі абсалютна ўсё.

КРЫЛЫ І ЗВАНОЧАК

Пачыналася ўсё, вядома, з пошты. Сярод шматлікіх спосабаў сувязі ў старажытнасці вылучаецца самы «рамантычны» — пры дапамозе птушак. У французскім Лілі нават усталяваны помнік такому «паштальёну» — голубу, які дастаўляў карэспандэнцыю ў часы вайнаў. Адразу пытаемся, ці карысталіся гэтым спосабам нашы продкі. Па словах Тамары Іванаўны, дакладнай інфармацыі пра службу птушак у якасці ганцоў у зусім «барадатыя» часы няма, затое гістарычным фактам лічаць наяўнасць галубінай пошты ў Брэсцкай крэпасці ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

А ці ведаеце вы, што азначае лагатып сучаснай «Белпошты» і што ляжыць у яго аснове? Старажытныя ганцы-паштары (а паштовая служба ў Вялікім Княстве Літоўскім пачала фарміравацца ў 1557 годзе) папярэджвалі аб сваім прыбыцці пры дапамозе спецыяльнага меднага рога, так гэты прадмет і стаў асацыявацца з дастаўкай карэспандэнцыі. Пазней ён быў заменены на званочак. Адзін з такіх, датаваны 1881 годам, захоўваецца ў музеі.

Ёсць тут і цікавыя для нумізматаў рэчы — першыя маркі, якія выкарыстоўваліся ў Беларусі: расійская 1857 года з двухгаловым арлом коштам 10 капеек і, вядома, першая ўласна беларуская — 1992 года, з выявай Крыжа Ефрасінні Полацкай. Нарэшце бачу сярод экспанатаў знаёмую рэч — невялікі стол з прымацаванымі металічнымі элементамі. Гэта ж нажная швейная машына з педаллю, у маёй бабулі такая дагэтуль стаіць!

— Гэта не швейная, а пачкавязальная машына, — усміхаецца Тамара Саломка. — Ёй карысталіся для таго, каб перавязваць пасылкі шпагатам. У канцы XIX стагоддзя пошта пачала карыстацца чыгункай, вось для паскарэння працы і прыдумалі такую рэч.

НЕГАТЫЎ ДЛЯ ПАЗІТЫВА

Больш сучасны спосаб сувязі — тэлеграф Морзэ — прадстаўлены ў шматлікіх мадыфікацыях. Само вынаходніцтва ў Беларусі з'явілася ў сярэдзіне XIX стагоддзя, а першая тэлеграма была адпраўлена з Мінска ў Бабруйск. Найбольш стары апарат у фондах — 1940 года выпуску. Ёсць яшчэ варыянты з пашыранымі магчымасцямі: электрамагнітны тэлеграф шматразовага дзеяння, на якім можна было перадаваць у адзін бок па адным провадзе адразу да шасці паведамленняў, і так званы старт-стопны тэлеграф з перфастужкай.

Дарэчы, у 1950 годзе мінскія работнікі-рацыяналізатары распрацавалі аўтаматызаваную прыстаўку для апошняга. Вынаходніцтва прадставілі на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве. Мінчане атрымалі першую прэмію і навукова-тэхнічную бібліятэку ў якасці падарунка. Цікава, што «сярэбраны прызёр» выставы быў узнагароджаны... аўтамабілем «Масквіч». Вельмі яскравае адлюстраванне прыярытэтаў тагачаснага грамадства. Акрамя тэкставых паведамленняў, па спецыяльным фотатэлеграфе ва ўсе канцы СССР перадавалі газеты, дакладней, негатывы палос, якія друкаваліся ўжо «на месцы». Тэлеграф у Беларусі працуе і цяпер — па нумары 166 вы і зараз можаце прадыктаваць усе свае «ТЧК» і «ЗПТ», а аператар перадасць іх адрасату. Праўда, у якасці канала сувязі выкарыстоўваецца не провад, а сучасны інтэрнэт.

ПАТЭЛЕФАНАВАЦЬ ЗА «ДВУШКУ»

Яшчэ адзін цікавы факт даведваемся, калі пераходзім да кутка, прысвечанага тэлефоннай сувязі. Аказваецца, да 1955 года пошта, тэлеграф і тэлефон у СССР падпарадкоўваліся Міністэрству ўнутраных спраў. Таму ўсе кандыдаты на пасаду, напрыклад тэлефаністкі, праходзілі жорсткі адбор, а форма служачых нагадвала вайсковую. Да будучых «барышань» былі свае патрабаванні: рост не меншы за 170 сантыметраў, узрост — да 25 гадоў, веданне нямецкай і французскай моў, а таксама... адсутнасць зарэгістраванага шлюбу.

— Рост патрэбен быў, каб дацягвацца да верхніх ячэек камутатараў, — тлумачыць загадчык музея. — А незамужніх бралі з той прычыны, што ад дзяўчат патрабавалася абсалютная канцэнтрацыя на сваіх абавязках. Жанчына, якая думае пра сям'ю, па меркаванні тагачасных спецыялістаў, для такой працы не падыходзіла. З гэтай жа прычыны абмяжоўваўся і ўзрост.

1896 год — час адкрыцця першай тэлефоннай станцыі ў Мінску. Яна знаходзілася на вуліцы Губернатарскай (цяпер — Леніна) у чатырохпавярховым будынку. У музеі захоўваецца так званы блэнкерны камутатар фірмы Ericsson на 100 нумароў. Знешне прылада нагадвае звужанае разы ў тры фартэпіяна, толькі замест клавіш на панэлі знаходзяцца ячэйкі для правадоў. Праз год у сталіцы было ўсяго 68 абанентаў — неверагодна дарагую сувязь маглі сабе дазволіць толькі самыя багатыя жыхары.

Пазней у Мінску з'явіліся аўтаматычныя тэлефонныя станцыі — адна з іх займала памяшканні цяперашняга музея. Асобныя стэнды з камутатарамі нават пакінулі на ранейшых месцах, толькі што ранейшага рабочага трэску яны не ствараюць. А вось сапраўды эпахальны экспанат — тэлефонная будка. Апарат у ёй, дарэчы, працуе — закінуўшы ў прыёмнік савецкую манету, наведвальнікі музея могуць пазваніць на любы рэальна існуючы нумар.

— Многія цяпер кажуць: маўляў, навошта нам у Мінску таксафоны, ва ўсіх мабільнікі, каму гэта трэба, — распавядае Тамара Саломка. — Але нядаўна мы атрымалі цікавыя статыстычныя звесткі: за 2014 год толькі ў сталіцы было здзейснена каля двух мільёнаў званкоў з такіх апаратаў. Яны дагэтуль усталяваны ў самых розных грамадскіх установах, і людзі імі карыстаюцца. Таму пакуль што прыбіраць таксафоны не мае сэнсу.

Усё гэта — толькі маленькая частка фондаў музея. Калі вас цікавіць не толькі сувязь, але і гісторыя ўласнай краіны — варта наведаць цэнтр, каб пабачыць усё гэта на свае вочы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

Фота Надзеі БУЖАН.

Скарыстаўшыся манетай, можна пазваніць на любы гарадскі нумар з таксафона родам з 1960-х.

Тэлефон ТА-ЦБ, выпушчаны ў Ленінградзе ў 1920 годзе.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 03 2016 г.

Папулярнай мовай

«ПАЎТАРАЙЦЕ НАШЫ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ ДОМА!»

І абавязкова размаўляйце па-беларуску

Пасля заканчэння школы я неверагодна радавалася таму, што мне больш ніколі не прыйдзецца вучыць фізіку. Але мінула тры гады — і я слухаю лекцыі па гэтай дысцыпліне. Побач са мной сядзяць школьнікі з бацькамі, студэнты, пенсіянеры. Нас, такіх розных, аб'яднала «Папулярная навука па-беларуску» — праект студэнткі 5 курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Анастасіі ПАЛТАРЖЫЦКАЙ. Нагодай для яго стварэння стала цікавасць дзяўчыны да роднай мовы.

«Калі рыхтуюся да лекцый, заўсёды адкрываю для сябе нешта новае», — кажа Насця.

— У мінулым годзе я толькі пачынала размаўляць па-беларуску, таму знаходзілася ў пастаянным пошуку людзей, з якімі магла б практыкавацца ў маўленні. Так выпадкова пазнаёмілася з прадстаўнікамі грамадскага аб'яднання «Знайдзі сваіх», якія займаюцца арганізацыяй беларускамоўных праектаў. Пэўны час я проста прыходзіла на іх мерапрыемствы, а аднойчы яны прапанавалі прыдумаць што-небудзь сваё. Паколькі я добра ведаю фізіку і ў мяне шмат знаёмых, таксама апантаных гэтай навукай, з'явілася ідэя арганізаваць лекцыі па-беларуску, — расказвае Насця.

Для таго, каб ажыццявіць праект, студэнтцы давялося зрабіць нямала: знайсці матэрыялы і перакласці іх на родную мову, прадумаць планы заняткаў, але самае складанае — адшукаць цікавых і аўтарытэтных лектараў, якія змаглі б гаварыць па-беларуску.

— Першыя лекцыі «Папулярнай навукі» адбыліся ў мінулым сакавіку. Прыгадваю іх і разумею, што яны дужа адрозніваюцца ад тых, што я ладжу сёння. Цяпер усё больш прадумана, структуравана. Аднак прыемна, што ёсць слухачы, якія прыходзяць на заняткі з таго самага часу. Менавіта гэтыя людзі ўвесь час дапамагаюць развівацца нашаму праекту, падказваюць, што можна было б дадаць, што змяніць, а ад чаго ўвогуле лепш адмовіцца.

Перад пачаткам восеньскага сезону лекцый студэнтка стварыла суполку ў сацыяльных сетках, якая называецца «Навука на балоце», дзе можна знайсці шмат навуковых фактаў, жартаў і анонсаў мерапрыемстваў па-беларуску, а таксама задаць пытанні адносна заняткаў.

Насця намагаецца зрабіць кожную лекцыю асаблівай, не падобнай на астатнія. Тлумачыць гэта тым, што важна, каб тэорыя абавязкова падмацоўвалася эксперыментамі, інакш людзі, не звязаныя з фізікай, наўрад ці зацікавяцца. Дзяўчына прызнаецца, што хоць і вучыцца на пятым курсе факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, кожны раз у час падрыхтоўкі лекцый адкрывае для сябе нешта незвычайнае, глядзіць на простыя рэчы па-новаму.

На апошніх перадсвяточных занятках навуковы супрацоўнік Акадэміі навук Беларусі Рыгор Русецкі паказаў, як пры дапамозе закону Архімеда праверыць, ці не падманулі вас у ювелірнай краме і ці сапраўднае золата прадалі, і стварыў «халадзільнік» са звычайнай вады і салетры. «У тэлеперадачах часта кажуць: «Не спрабуйце паўтараць гэта ў хатніх умовах», а мы, наадварот, раім паўтараць нашы эксперыменты дома! — кажа з усмешкай Рыгор і дадае: — Увогуле, на большасць з іх нас натхняюць жыццёвыя сітуацыі».

За час існавання «Папулярнай навукі» Анастасія Палтаржыцкая выпрацавала ўласныя «фішкі» паспяховасці лекцый:

— Паміж выступоўцам і слухачамі павінен быць дыялог. Каб матываваць прысутных на ўзаемадзеянне, за кожны правільны адказ на пытанне мы даём зялёны яблык, які ўжо стаў сімвалам нашых заняткаў. Акрамя гэтага, аніводны эксперымент не абыходзіцца без удзелу людзей з залы.

Уваход на лекцыі вольны. Падрабязнасці шукайце ў суполцы «Навука на балоце» на сайце http://vk.com.

Ганна КУРАК,
студэнтка IV курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Рыгор Русецкі і Анастасія Палтаржыцкая паказваюць, як дзейнічае эфект усмоктвання.

«Каб матываваць прысутных на ўзаемадзеянне, за кожны правільны адказ на пытанне мы даём зялёны яблык, які ўжо стаў сімвалам нашых заняткаў».

Разам мы — талака!

НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАСПЛЭЙ,

або Як знайсці сябе праз мінулае

У апошнія гады мода на беларускае пачала вяртацца. Але ёсць тыя, хто справе вывучэння і прасоўвання роднай культуры аддае ўвесь свой вольны час ужо на працягу многіх гадоў. У якасці прыкладу можна прывесці гомельскую маладзёжную краязнаўчую арганізацыю «Талака», якая існуе з 1986 года, і яе кіраўніка Яўгена МЕРКІСА.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Яўген, як вы трапілі ў «Талаку»?

— З дзяцінства я вельмі цікавіўся гісторыяй, асабліва захапляўся старажытнымі Грэцыяй і Рымам. У выніку паступіў на гістфак БДУ. Вядома, цікавіла мяне і наша мясцовая гісторыя. І чым больш пра яе даведваўся, тым больш разумеў, што ў ёй хапае «белых плям». Гэта вельмі добра заўважна па маім родным Гомелі.

У «Талаку» мяне прывялі сябры ў 2009 годзе. Прывабіў яе краязнаўчы бок, а потым высветлілася, што ёсць і фальклорна-этнаграфічны — той самы «экшн», які заўжды прыцягвае людзей. Атрымліваецца такі беларускі касплэй, толькі пераапранаемся мы не ў адзенне герояў поп-культуры, а ў нацыянальныя строі, каб паглыбіцца ў мінулае. Так супала, што калі я прыйшоў, змянялася кіраўніцтва і мяне абралі новым старшынёй. Я займаўся сацыяльнымі сеткамі, інтэрнэтам, што было яшчэ дастаткова новай з'явай. Можа быць, убачылі мой патэнцыял.

— Колькі чалавек супрацоўнічае з арганізацыяй цяпер і чым яны займаюцца?

— Афіцыйна ў нас зарэгістравана каля 25 членаў, але ёсць і «пазаштатнікі». Адно з самых буйных нашых мерапрыемстваў — Купалле — штогод збірае 50-80 чалавек, думаю, на гэту лічбу і можна арыентавацца.

Ёсць некалькі кірункаў працы. Першы — гісторыка-краязнаўчы. Спрабуем даследаваць наша мінулае і даносіць інфармацыю да людзей праз сайт, сацыяльныя сеткі, ладзім публічныя лекцыі і вечарыны, прысвечаныя нейкім гістарычным падзеям. Раней актыўна здымалі краязнаўчыя фільмы. Другі — фальклорна-этнаграфічны, пра які я ўжо трохі казаў. Гэта арганізацыя экспедыцый для збору і аднаўлення нематэрыяльнай спадчыны. Адзначаем большасць свят абрадавага года, у тым ліку некаторыя ўнікальныя, скажам, жаніцьбу коміна (а не Цярэшкі) — сакральны абрад першага восеньскага прапальвання коміна ў хаце. І трэці кірунак — грамадска-асветніцкі. Праводзім супольныя вечарыны, тусоўкі, супрацоўнічаем з іншымі ўстановамі і праектамі.

— Як думаеце, што вабіць моладзь у мінуўшчыне?

— Нельга сказаць, што гэтым цікавяцца толькі гісторыкі. Звычайна новыя людзі трапляюць да нас праз сваіх сяброў. Нехта кажа: «Давай з'ездзім на Гуканне вясны, гэта цікава». Чалавек пагаджаецца, а ўжо потым пачынае сам уцягвацца. З іншага боку, некаторым людзям проста цікава даведацца больш пра сваю гісторыю, пра якую, я лічу, мала распавядаюць у сучасных медыя. Уявіце: у нас дагэтуль застаюцца актуальнымі этнаграфічныя экспедыцыі, хоць на Захадзе знік сам тэрмін. Там кажуць, што ўжо няма чаго збіраць, варта толькі асэнсоўваць. А маладым гэта даспадобы — паехаць у глухую вёску запісваць фальклор і абрады. Непачаты край для магістарскіх і доктарскіх!

Дарэчы, шмат у каго такое хобі перарастае ў нешта большае. Напрыклад, талаковец Пятро Цалка цяпер узначальвае Гомельскі філіял Веткаўскага музея старажытнабрадніцтва і беларускіх традыцый. За гэты час ён зрабіў з музея сапраўдную «цукерку»: там увесь час адбываюцца цікавыя майстар-класы, выставы. З арганізацыі выйшла нямала вядомых журналістаў, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў...

— Ці шмат у традыцыях Гомельшчыны адрозненняў ад агульнабеларускіх?

— Тут велізарныя магчымасці для вывучэння самых розных з'яў у беларускай культуры. Па-першае, ёсць чароўны край пад назвай Палессе. З іншага боку, мы «чапляем» Падняпроўе, таксама вядомае сваімі традыцыямі. Побач мяжа з расійскімі і ўкраінскімі тэрыторыямі. Таму маем у адным месцы фактычна паганскі абрад «Пахаванне стралы», а за пару дзясяткаў кіламетраў — традыцыі праваслаўных стараверaў, якія перапляліся з мясцовымі.

— Як, па-вашаму, трэба сёння папулярызаваць беларускае?

— Найперш абавязкова — працаваць з установамі адукацыі. У Гомелі ў ранейшыя часы была вельмі моцнай традыцыя дзіцячага калядавання. Для мяне ў свой час стала сюрпрызам, што ў Мінску гэтага няма. У нашым горадзе, калі за вечар праз тваю кватэру «па цукеркі» не прайшло 15-20 груп дзяцей, ты пачынаў хвалявацца. Шкада, але гэта паволі знікае — сёлета да мяне завітала, можа, пяць такіх кампаній. Чаму б кожнай школе не захоўваць набор беларускіх абрадаў ці песняў? Іх можна было б выконваць па пэўных датах, а ў галовах дзяцей гэта засталося б на доўгі час...

«Талака» спрабуе асвойваць і новыя фарматы. Пару гадоў таму мы зрабілі альтэрнатыўную карту Гомеля: самі выбралі легенду і адлюстравалі тое, што палічылі патрэбным. Напрыклад, гістарычныя славутасці і нават мары, кшталту гомельскага метро. Вялікім поспехам цяпер карыстаюцца нашы веласіпедныя экскурсіі, трэба працягваць і гэту практыку.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Мінск — Гомель — Мінск

Тое, што аб'ядноўвае

З «Табурэткай» вучыцца весялей

Паступіўшы ў ліцэй, я адразу зацікавілася газетай навучальнай установы пад назвай «Табурэтка». Гэта не проста выданне, дзе публікуюцца артыкулы навучэнцаў, а цэлы свет ліцэйскіх традыцый, свят, мерапрыемстваў, уражанняў. Гэта наша жыццё. Кожная старонка «Табурэткі» напоўнена аптымізмам, радасцю, шчасцем, прыязнасцю, што падштурхоўвае вучняў акунуцца ў свет творчасці і паспрабаваць свае сілы ў допісе ў газету, развіць свой талент.

Усе нашы ліцэісты — вельмі таленавітыя, крэатыўныя, творчыя і актыўныя. Кожны з іх прымае удзел у розных мерапрыемствах, занятках і гуртках, каб зрабіць сваё жыццё больш разнастайным і вясёлым. І вось адзін з любімых заняткаў — гэта праца ў «Табурэтцы». Любы, хто хоча паспрабаваць свае сілы ў напісанні артыкулаў, апавяданняў, можа далучыцца да яе.

Адным з такіх аўтараў з'яўляецца Ксенія Львова-Каржанеўская, вучаніца 10-га гісторыка-грамадазнаўчага класа. Дзяўчына вельмі таленавітая, цікавіцца творчасцю, любіць апісваць тое, што адбываецца вакол. Паступіўшы ў навучальную ўстанову, Ксеніі вельмі захацелася напісаць артыкулы пра нашы самыя лепшыя падзеі: турыстычную сцежку і «Віват, ліцэй!». Тое, што адбываецца падчас іх, застаецца ў памяці на доўгі час. Гэтыя эмоцыі і змагла перанесці на паперу Ксенія. Чытаючы яе артыкулы, мы зноў вяртаемся ў той час, калі праходзілі нашы святы, прысвечаныя паступленню вучняў у ліцэй.

У «Табурэтцы» мы пішам не толькі пра мерапрыемствы, якія праходзяць падчас вучобы, але і пра нашы сумесныя паездкі, якія адбываюцца на канікулах. Кожны, хто ўдзельнічаў у іх, можа падрыхтаваць свой артыкул пра гэтыя дні. Напрыклад, Юлія Неўдах, вучаніца 11-га літаратурнага класа, падзялілася на старонках газеты сваімі ўражаннямі ад вандроўкі ў Санкт-Пецярбург. Дзякуючы аўтарцы вучні і настаўнікі змаглі нібыта на свае вочы ўбачыць славутасці Піцера.

Я таксама, паступіўшы ў ліцэй, паспрабавала сябе ў гэтай справе. Напрыклад, падрыхтавала артыкул пра палатачны лагер, у які мы ездзілі на летніх канікулах. У ім я адлюстравала падзеі, што адбыліся за дзевяць дзён нашага адпачынку, тое, як хутка ліцэісты становяцца адной вялікай сям'ёй і як мы ганарымся сваім сяброўствам.

Ганна КУРТАСАВА,
вучаніца 11 класа
ліцэя №2 г. Мінска.

Не страціць галоўнае

БАЛЬ КАХАННЯ, або Гісторыя вечнага пачуцця

Містычныя гісторыі і таямніцы... Яны прыцягваюць нас і праз стагоддзі. Цікавыя мясцовыя легенды можна пачуць у кожным рэгіёне. Напрыклад, пра Радзівілаў — вялікі беларускі княжацкі род — гісторый сабралася столькі, што з'явіўся нават цэлы мюзікл «У замку Радзівілаў, або Гісторыя вечнага кахання». Я пагутарыла пра яго з адным са стваральнікаў — сцэнарыстам і рэжысёрам Таццянай Міхайлаўнай СІНКЕВІЧ.

Аўтары і выканаўцы мюзікла пасля прэм'еры.

Мюзікл складаецца з дзвюх частак. У першай распавядаецца пра гісторыю кахання Барбары Радзівіл і Жыгімонта Аўгуста — кароля Польшчы і ВКЛ. Як мы ведаем, Барбара была атручаная. Існуе легенда, што Чорная дама (яна ж Барбара) дагэтуль ходзіць па Нясвіжскім замку ў пошуку вечнага спакою. Далей галоўныя героі спускаюцца на зямлю, дзе адбудзецца баль кахання. На яго запрошаны не толькі Барбара і Жыгімонт, але і іншыя вядомыя гістарычныя пары: Рамэа і Джульета, Арфей і Эўрыдыка, Дон Кіхот і Дульсінея.

А потым мы трапляем у сучасны свет... У адным з тэатраў сустракаюцца маладыя таленавітыя акцёры, якія выконваюць ролю закаханых, але мы даведаемся аб іх любоўнай сувязі і ў рэальным жыцці.

— Ідэя мюзікла стала блізкай шмат якім оперным спевакам, думаю, менавіта таму акцёрскі склад быў такім моцным: Уладзімір Громаў (заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь), Таццяна Гаўрылава («зорка» опернага тэатра), Вольга Сотнікава (лаўрэатка міжнародных прэмій). Упершыню ён быў паказаны на сцэне Вялікай залы філармоніі і выклікаў сапраўдны фурор!

— Як вы думаеце, чаму мюзікл так захапіў акцёраў?

— Мне падаецца, што з-за сюжэта і выдатнай музыкі Ганны Казловай. Яна з роду Глінкі! Працуе ў розных жанрах. Эксперты ў галіне музыкі, якія рэгулярна наведваюць канцэрты Ганны Маратаўны, кажуць: «Прафесіяналка! Беларускі Чайкоўскі!»

Рэпетыцыі перад прэм'ерай праходзілі, дзе толькі магчыма: і дома ў Ганны Казловай, і дома ў акцёраў, і ўдзень, і ўначы... Мы працавалі на такім энтузіязме! Я ганаруся, што мне з Ганнай Маратаўнай удалося стварыць якасны айчынны мюзікл.

— Што змянілася за чатыры гады?

— Склад акцёраў, задзейнічаных у мюзікле, памяняўся на 70 працэнтаў. З мінулага года ў нас на праекце змяніўся рэжысёр — ім стаў Ігар Пятроў з тэатра Янкі Купалы. Кожны чалавек прыўносіць нешта новае! Вось і паглядзім, што атрымаецца сёлета. Нас запрашаюць выступаць на розных пляцоўках Мінска кожны год. Спадзяюся, што новая сустрэча з творам не расчаруе!

— Скажыце пра самае галоўнае, што вы хацелі данесці да гледача.

— Сённяшняе разуменне кахання зусім іншае: цяпер ніхто не хоча ахвяраваць сабой дзеля сваёй палавінкі, ісці на ўступкі, здзяйсняць подзвігі! Вось пра гэта і спектакль: як трансфармуецца каханне... Ці такое ж яно, як было тады? Хутчэй за ўсё, не, але нешта галоўнае, тое, што мы называем гэтым словам, застаецца і захоўваецца і праз стагоддзі. Глядзіце на каханне сур'ёзней! Гэта далікатнае трапяткое пачуццё. Чытайце кнігі, бо менавіта адтуль мы і павінны браць прыклад!

Арына АРЛОВА,
вучаніца 10 класа
гімназіі №3 г. Мінска.

Усё ў тваіх руках

ХОЧАЦЕ СТАЦЬ... ВЫДАЎЦОМ?

Мы даўно прызвычаіліся да выразу «попыт нараджае прапанову» і «з радасцю» засвоілі гэтае правіла. «А што ж тут не так? Лагічная схема!» — напэўна, прамовіць хто-небудзь. «А галоўнае — добра знаёмая», — так і хочацца дадаць. Але сур'ёзнай размовы не будзе. Расповед — пра магчымасці.

Дакладней, пра магчымасць-прапанову, дзеля якой было створана адзінае ў сваім родзе чытацкае выдавецтва «Бярозка». Цяпер кожны, каму трапіць у рукі аднайменны часопіс, можа самастойна стварыць кнігу. Штомесяц, пачынаючы са студзеня, у «Бярозцы» друкуецца аповесць-канструктар — спецыяльныя старонкі, якія зручна прыстасоўваць адну да адной, а сабраўшы, атрымаць поўную друкаваную версію новага літаратурнага твора маладога аўтара — і стаць... незалежным выдаўцом.

Чытацкае выдавецтва «Бярозка» сваім першым творам «убачыла» фантастычную аповесць Аліны Длатоўскай «Арнаменты». На яе напісанне аўтарку натхніла незвычайнае месца: «стары хутар у Валожынскім раёне, які мае абсалютна неверагодную энергетыку».

Хатнік.

«Усё дзяцінства я правяла там, як у казцы. Для мяне Лясун, Хатнік ды іншыя фантастычныя істоты не такія ўжо нерэальныя. Я даўно хацела напісаць твор пра беларускую міфалогію — яна вельмі незвычайная, своеасаблівая, захапляльная...» — расказвае Аліна Длатоўская ў інтэрв'ю для лютаўскага нумара часопіса «Маладосць».

Таямнічыя суполкі, Унутраны і Знешні свет, адказ на пытанне «Што трэба рабіць, каб трапіць пад Купал?» і шмат іншага незямнога можна сустрэць у «Арнаментах». А таксама філасофскія разважанні і пошукі адказаў на далёка не падлеткавыя пытанні. «Сямнаццатае лета ў жыцці абяцала прайсці паўз яе, як праходзяць незнаёмыя людзі. Куды яны ідуць? А колькі з тых, што разам з ёю чакаюць аўтобуса, ведаюць, чаго яны чакаюць ад жыцця? І ці можна ўвогуле да чагосьці прыйсці? Ці кожны проста ідзе, пакуль не ўпадзе, ствараючы па дарозе сям'ю, кар'еру, непрыемнасці і такіх самых бязмэтных істот, як сам? Тады які сэнс ісці? Не, не можа быць усё так проста. Сусвет не губляў бы энергію на такую колькасць бязмэтных істот. Значыць, яны ўсе тут з пэўнай мэтай. Але з якой?»

Пытанне, на якое вельмі важна знайсці адказ, што і спрабуе рабіць адзін з персанажаў аповесці. Адказ сапраўды існуе. Яго кожны чалавек шукае асабіста. А чытацкае выдавецтва «Бярозка» прапануе магчымасць пачаць пошук, самастойна ствараючы сапраўдную кнігу.

«А як жа попыт?» — напэўна, спытае хто-небудзь. Галоўнае, каб быў попыт на адказ...

Юлія ВАЎЧОК.

Друкуецца ў «Бярозцы»

Аліна ДЛАТОЎСКАЯ

АРНАМЕНТЫ

Урывак

АЛІСА ляжала на траве і, выставіўшы пад промні худзенькія ногі, разглядала праз сонечныя акуляры яркія летнія нябёсы. Яна ўжо некалькі разоў бралася чытаць кнігу, але шораз адкладала яе. Паглыбіцца ў містычны сусвет прыгод не дазваляў неспакой за малодшую сястру. Цяпер Агеньчык цэлымі днямі недзе бадзяецца з новым сябрам — шэрым дваровым катом. Тут, у вёсцы, надта шмат свабоды для малой. З кожным днём яна робіцца больш гарэзлівай і свавольнай. На пытанне «Чаму ў ката мужчынскае імя?» малая адказвала: «Таму што яго так завуць». На пытанне: «Ты дзе была?» адказвае: «Там». Аліса павінна была даглядаць малодшую сястру, таму паводзіны малой яе вельмі непакоілі.

Ката да Алісы малая чамусьці не падпускала, а як толькі ён набліжаўся, сурова заўважала: «Не заляцайся!» Спаць у хату яго таксама не запрашала. Аліса, вядома, была рада, але здзіўлена. У горадзе Агеньчык увесь час цягала дадому розных брудных коцікаў ды блыхастых шчанюкоў. А старэйшая сястра, ясная справа, была вымушана шукаць ім новых гаспадароў сярод сваіх сяброў, бо мама была катэгарычна супраць любых свойскіх жывёлін. Нават рыбак.

Дзяўчына пастукала пазногцікамі па вокладцы кнігі, цяжка ўздыхнула і ўзнялася. Трэба знайсці малую ды пачынаць гатаваць абед.

Агнія сядзела на галіне яблыні, даволі высока, і целяпала ножкамі ў жоўтых кедах, чухаючы адной рукой кату за вухам. Алісу здіўляла, што ў звычайнага вясковага ката адно вуха чорнае. Яна бачыла катоў розных колераў, але ў гэтым было нешта асаблівае. Хоць яго расфарбоўка турбавала яе менш, чым адлегласць Агніі да зямлі.

— О, Аліса, прывітанне!

— Ты як туды патрапіла?

— Юрась мяне падсадзіў.

— Тады хай ён цябе адтуль і здымае! Што вы там увогуле робіце?

Аліса злавалася ўсё больш. Няўжо яна дзесяць гадоў таму таксама так мала думала галавой і так шмат рызыкавала здароўем? А калі малая саслізне? Ці галіна зламаецца? Яе будзе Юрась лавіць?

— Юрась распавядае мне розныя цікавінкі.

— На зямлі яны б гучалі недастаткова цікава?

Малая не пачула іроніі ў яе словах і сур'ёзна згадзілася:

— Ну, але... Ведаеш, акрамя Хатніка, аказваецца, ёсць яшчэ Хлеўнік. Ён жыве ў хляве.

— Угу. Дай-ка здагадаюся: ён даглядае свойскую жывёлу?

— Не толькі! Калі яго не паважаць, дык ён, наадварот, крыўдзіць жывёлу, кудлаціць, заблытвае поўсць, крадзе сена. І яшчэ малако ў кароў!

— Неверагоднае паскудства. Ты збіраешся злазіць?

Цікава, ці хопіць ёй моцы зняць або злавіць сястру? Мо ўскараскацца за ёй на дрэва?

Кот вадзіў лапкай па пысцы, нібы бянтэжыўся. Ды не, ён проста ўмываўся.

— Я не настолькі старая, каб ты прапаноўвала мне ў пару ката.

— Ён не кот.

— Ну канешне.

— Чаму ты мне не верыш?

— А ў што я павінна верыць? У тое, што гэты шэры блыхасцік — насамрэч прыгажун-юнак, які ўмее змагацца з нячысцікамі? Хочаш так лічыць — на здароўе, але мяне ў свае гульні не ўблытвай. А яшчэ, каб ты ведала, каты ўмеюць толькі залазіць на дрэвы, але не злазіць, — з гэтымі словамі Аліса пайшла дадому, так і не зняўшы сястру.

— Зусім гэта не гульня, — пачулася ўслед. — А Юрась — не кот!

Няўжо яна ў дзяцінстве таксама так дрэнна размяжоўвала рэальнасць і фантазіі? Няўжо яна таксама знаходзіла сяброў сярод жывёл, цацак і раслін? І колькі гэта ўвогуле нармальна? Можа, за малую ўжо варта пачынаць хвалявацца? З іншага боку, яна і сама дагэтуль уцякае ў свет фантазій, калі чытае кнігі. Ці моцна гэта адрозніваецца ад Агеньчыкавых прыдумак? Дык калі яна дапускае існаванне фантастычных сусветаў на старонках, чаму не можа існаваць такі ж сусвет у галаве яе малодшай сястры?

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 03 2016 г.

SEX=БАЛЯСЫ

СКОТЧ! ДВА РАЗЫ!

«Я здзіўляюся!» Гэтая фраза рэфрэнам гучала на працягу ўсёй навелы ў фільме «Новы Адэон» з вуснаў гераіні Раксаны Бабаян. Яна іграла ролю жонкі пакупніка — «гарачага мужчыны» з поўдня ў выкананні Аляксандра Панкратава-Чорнага. У адказ на кожны яго нелагічны ўчынак яна толькі і магла, што ўсклікнуць: «Я здзіўляюся!» Што яшчэ заставалася рабіць усходняй жанчыне, калі галава ў сям'і ён: як сказаў, так і будзе. Прадухіліць непапраўнае немагчыма, застаецца толькі гэта фраза. Да чаго я гэта? Ды сам сабе здзіўляюся, што не перастаю здзіўляцца. Падавалася б, ужо мог і прызвычаіцца, а вось не атрымліваецца! Заспакойваю сябе толькі тым, што, гавораць, гэта станоўчая якасць, якая дазваляе заўважаць фарбы жыцця. Праўда, і «фарбы» бываюць рознымі...

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мінулы раз мы гаварылі пра кліп на песню «Экспанат» групы «Ленінград». Памятаеце, пра лабутэны? Прабачце, звычайна не ў правілах аўтара вяртацца да ранейшай тэмы, але тут, пагадзіцеся, выпадак асаблівы. Дарэчы, вас ужо «адпусціла»?.. («Вы чулі, што АўтаВАЗ» заявіў аб выпуску новай мадэлі аўтамабіля — «Лады Лабутэн» з чырвоным днішчам?») Колькасць гледачоў кліпа ўжо даўно пераваліла за 50 мільёнаў, яго пераклалі на італьянскую мову, знялі некалькі пародый. Больш за тое, у Маскве каля 400 мужчын з імем Сяргей, а таксама 500 дзяўчат на абцасах вышынёй больш за дзесяць сантыметраў пабывалі на выстаўцы «Ван Гог. Ажыўшыя палотны». Дарэчы, саму яе экспазіцыю падоўжылі да 8 сакавіка. Прыгажунь, якія хацелі патрапіць на выставу бясплатна, прасілі прыкласці абутак да спецыяльнай таблічкі, каб пацвердзіць, што абцас дастаткова высокі. Мужчыны з імем Сяргей маглі прайсці са спадарожніцай з 50-працэнтнай зніжкай, паказаўшы свой пашпарт. «Я здзіўляюся!» Хоць у гэтым выпадку дзякуючы туфлям з чырвонай падэшвай людзі маглі далучыцца да свету прыгожага. Няхай і паўжартам, але карысць несумненная.

У сваім блогу яна вырашыла раскрыць тайну ідэальнага дэкальтэ. Дык вось, трымайцеся! Грудзі трэба падклеіць... скотчам, моцна іх прыпадняўшы.

А вось пра што думалі зламыснікі ў Германіі, якія вырашылі ўзламаць і абрабаваць аўтамат па продажы... прэзерватываў? Як потым у паліцыі прызналіся выжыўшыя сябры, хацелі атрымаць і «гумавыя вырабы», і ўласна грошы. Чаму я кажу пра ацалелых? Бо маладыя мужчыны вырашылі прыбраць да рук і прэзерватывы, і сродкі з аўтамата пры дапамозе... самаробнай бомбы. Не, патрэбу і ў першым, і ў другім зразумець магу, але... Пагадзіцеся, выбух і захаванасць цэласнасці «вырабу нумар два» — гэта дзве абсалютна несумяшчальныя рэчы. «Я здзіўляюся!» Нават калі дапусціць, што грошы ўсё ж цікавілі зламыснікаў нашмат больш, чым гумавы тавар, ці не тое ж з імі павінна было адбыцца пасля ўздзеяння выбухоўкі? У выніку няўдалай спробы — пасля закладкі бомбы тры сябры не паспелі дабегчы да аўтамабіля і схавацца ў ім — аднаму з іх асколкам таго самага аўтамата прабіла галаву...

Відаць, нешта закранула і галоўку вядомай 35-гадовай мадэлі Кім Кардаш'ян, якая нядаўна шакіравала грамадскасць як уласным вынаходніцтвам, так і сваім жа самавыкрыццём. «Я здзіўляюся!» А, не ўсе ведаюць, хто гэта такая?.. Асоба, знакамітая ў першую чаргу тым, што яе бюст толькі крыху саступае па памеры таму месцу, дзе спіна губляе сваю ганарлівую назву. Пасля нядаўніх вядомых здымак «пятай кропкі» мадэль вырашыла зрабіць акцэнт і на іншых сваіх выпукласцях. Яна выбірае строі, дэкальтэ якіх заканчваюцца недзе ў раёне пупка. Пры гэтым дзіва не носіць бюстгальтар, але яе вабнасці пры гэтым выглядаюць акруглымі і прыўзнятымі. Вось толькі якім чынам мадэль гэтага дасягае?.. Калі даведваешся пра тое, у галаву адразу прыходзіць жарт каманды Вышэйшай лігі КВЗ «Камызяцкі край»: «Ах ты, пена мантажная!» У сваім блогу яна вырашыла раскрыць тайну ідэальнага дэкальтэ. Дык вось, трымайцеся! Грудзі трэба падклеіць... скотчам, моцна іх прыпадняўшы. «Я спрабавала розныя віды клейкай стужкі — ад сантэхнічнай да малярнай», — прызнаецца мадэль. «Я здзіўляюся!» У сеціве можна нават пабачыць, як яе трэба правільна выкарыстоўваць. Бяром адзін кавалак скотча, потым яшчэ адзін... Уяўляю сабе, як цяпер у будаўнічых крамах і на рынках краіны прадстаўніцы прыгожага полу будуць уганяць у ступар гандляроў малярнай стужкі сваімі закупкамі. («Алена ўцягнула Грэцыю ў вайну з Трояй, а ты нават жывот уцягнуць для фатаграфіі не можаш».)

Добрая знаёмая разам з сяброўкай вырашылі зрабіць на мужчынскае свята падарунак сваім сужэнцам. Ведаеце, які? («Так, брытва ў яго ёсць, пена для галення ёсць, шкарпэткі ёсць... Як складана выбраць падарунак чалавеку, у якога УСЁ ёсць!») Тры гадзіны ў спа-салоне... І вось знаёмая піша, што яны былі вельмі здзіўленыя рэакцыяй мужчын на прэзент... Яны здзіўленыя?!. Гэта «я здзіўляюся»! Кажу, як можна было такое прапанаваць нашчадкам суровых беларускіх партызанаў? Ну, наведванне саўны ці басейна, зразумела. Але спа-салон... Ведаеце, дзяўчаты, калі ёсць выбар паміж падарункам «шкарпэткі — трусы — пена для галення» і ніякім, асабіста я выбраў бы другі варыянт. Але калі ў якасці альтэрнатывы выступае спа-салон, давайце вашы «шкарпэткі — трусы — пену для галення»... Знаёмая адказала, што будзе выпраўляць сітуацыю (пасля вяртання сужэнца з таго салона) смачнай вячэрай. Дык з гэтага ж і пачынаць трэба было! Упэўнены, што яе мужчына быў прыемна здзіўлены. Магчыма, нават падышоў да бара і арганізаваў для тосту ў гонар жонкі скотч. Два разы.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Я СТАЛА БОЛЬШ ГНУТКАЙ, АЛЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Але аўтар музыкі Алег Молчан, знаходзячыся з Сяргеем у канфлікце, катэгарычна забараніў нам выконваць кампазіцыю, пра што мы даведаліся з часам. Потым стала вядома, што наша версія песні не ўвойдзе ў альбом, бо Алег Уладзіміравіч супраць. На канцэрце мы ўсё ж вырашылі яе выканаць, але я сказала: гэта робіцца першы і апошні раз. Пасля чаго на мяне і на маіх музыкантаў Молчан падаў у суд. Разумеючы, што чалавек зводзіць асабістыя рахункі, прыкрываючыся творчасцю, мне хацелася давесці справу да канца... Непрыемна было на фоне той сітуацыі чуць ад людзей, якія не знаёмыя з творчасцю групы, быццам мы сталі выкарыстоўваць вядомы твор, бо ў нас няма нічога свайго. І хачу паведаміць, што «Мая малітва» — пяты альбом групы. І аднайменная песня на той момант была першым каверам за ўсю гісторыю нашага існавання.

— Назіраючы за вамі ў гэтай сітуацыі, можна зрабіць выснову, што вы прынцыповы чалавек...

— Мне складана ацэньваць сябе, але ведаю, што стала больш гнуткай, чым была нават дзесяць гадоў таму. Ёсць меркаванні іншых людзей, і да іх варта прыслухоўвацца. А ўсе тыя падзеі, якія адбываюцца са мной і з гуртом Naka, у пэўнай ступені з'яўляюцца лёсавызначальнымі. Я веру ў філасофію ўсяго, што адбываецца навокал. Бо кожная сітуацыя нас вучыць па-іншаму думаць, адчуваць. Калі здараюцца рэчы, якія мяжуюць з несправядлівасцю, то я дзейнічаю прынцыпова. І буду да канца адстойваць сваю пазіцыю.

— У вас ёсць антываенная песня «Пра любоў», якую вы выконваеце з Ганнай Хітрык і Святланай Бень. Кампазіцыю вы ахарактарызавалі так: «Яна пра вайну побач і ўнутры нас саміх». На вашу думку, што больш страшна?

— У першую чаргу вайна ідзе знутры. І мне здаецца, што тут важную ролю адыгрывае праца кожнага з нас над тым, каб не было азлобленасці ў сэрцы. Чым менш у чалавеку зла і агрэсіі, тым менш ён паддаецца на правакацыі, якія прыводзяць да ўзнікнення вайны ў свеце. Зразумела, што ёсць тыя, хто кіруе, і тыя, хто падпарадкоўваецца. Але да моманту, пакуль у чалавеку адсутнічае нянавісць да бліжняга, ён не адгукнецца на заклік яму нашкодзіць. А цяпер такое адчуванне, быццам людзі замбіраваныя. Сваё меркаванне яны фарміруюць, абапіраючыся на інфармацыю, якую чэрпаюць з інтэрнэту і тэлебачання, замест таго, каб думаць уласнай галавой. І наша песня гаворыць пра тое, што калі мы ўсе ўспомнім пра любоў, то намі ніхто не зможа кіраваць.

— Акрамя «Маёй малітвы» ў новым альбоме ёсць і іншыя песні на вершы беларускіх паэтаў...

— Я і сёння аддаю перавагу ў асноўным творам класічнай літаратуры. Перыядычна чытаю і некаторых сучасных аўтараў. Але мне бліжэй і больш зразумелая сістэма каардынат, якая хаваецца ў класіцы. Калі казаць пра пісьменнікаў, чые творы моцна паўплывалі на мяне, то ў беларускай літаратуры гэта перш за ўсё Уладзімір Караткевіч. Прычым яго паэзія. З рускіх творцаў — Фёдар Дастаеўскі. Я ўвогуле шмат чытаю. Цяпер з вялікім задавальненнем перачытваю раман Льва Талстога «Уваскрэсенне». Для мяне гэты твор проста адкрыццё, бо ён актуальны і сёння, што тычыцца ваенных падзей і пазіцыі, якую пісьменнік выказвае там пра рускі свет. Некаторыя абзацы можна браць і цытаваць.

— Раскажыце пра каманду, якая сёння стварае гісторыю гурта Naka...

— Група — мой аўтарскі праект. Зразумела, у нейкіх момантах я дзейнічаю прынцыпова, аднак мне важна, каб музыканты таксама мелі магчымасць выказвацца і прыўносіць у нашу працу нешта сваё. Сёння я супрацоўнічаю з сапраўднымі прафесіяналамі. Іра Кліменка ў групе амаль з самага пачатку існавання праекта. Валерый Прыёмка — таленавіты і адданы справе музыкант. Аляксей — наш бас-гітарыст — гэта чалавек, які стаяў каля вытокаў беларускага рок-н-рола. У яго багаты вопыт працы і сёння мы сталі настолькі блізкімі ў плане творчасці, што разумеем адно аднаго з паўслова. Хачу адзначыць і Анатоля Ярашэнку, гітарыста, які з'явіўся ў калектыве паўтара месяцы таму, але за такі кароткі час вывучыў складаную праграму, па-свойму ажывіў яе. І не прыслухацца да яго з майго боку было б глупствам. Таму музыкантам нізкі паклон за тое, што падтрымліваюць і разумеюць мяне.

«Кожная сітуацыя нас вучыць па-іншаму думаць, адчуваць. Калі здараюцца рэчы, якія мяжуюць з несправядлівасцю, то я дзейнічаю прынцыпова. І буду да канца адстойваць сваю пазіцыю».

— Ведаеце, кожны раз, калі сустракаюся з вамі, у мяне ўзнікае ўражанне, быццам вы чалавек без узросту. Сакрэт у музыцы?

— Мне здаецца, што старасць не залежыць ад узросту. Яна наступае тады, калі чалавек перастае дзейнічаць. Я адчуваю сябе поўнай энергіі, сіл і маладосці. Напрыклад, побач са сваёй дачкой я нібыта яе равесніца. Хоць, зразумела, жыццёвы вопыт дае пра сябе знаць. Лічу, што вельмі важна берагчы сваё ўнутранае дзіця, бо тады ты не баішся спрабаваць новае, і застаешся пры гэтым шчырай і даверлівай.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.108.
Нумар падпісаны ў 19.30 02.03.2016 г.

ЖУРНАЛІСТЫКА — ГЭТА ЛАД ЖЫЦЦЯ

Дадзеную мудрасць усім нам падарыў Журналіст, Даследчык, Настаўнік Стральцоў Барыс Васільевіч...

Прамаўляючы гэтае імя, выпускнікі журфака розных пакаленняў мяжы XX—XXI стагоддзяў не шкадуюць цёплых слоў, не скупяцца на эмацыянальныя ўспаміны, не абмяжоўваюцца ў развагах рэтраспектыўным «быў». Часцей у настальгічных меркаваннях націскаюць на аптымістычным «ёсць» — у журналісцкай творчасці кожнага паасобку і цэлых рэдакцыйных калектываў. Думку акцэнтуюць на верагоднасці прадаўжэння яго здабыткаў і высілкаў у навуцы і педагогіцы. У адкрытых дыскусіях падкрэсліваюць неабходнасць працэсу нарошчвання яго навуковых палеткаў працамі вучняў і прадаўжальнікаў справы.

Вечнасць Настаўніка. У пацвярджэнне гэтага тэзісу прывяду гістарычныя радкі загалоўкаў газет часу бязлітаснай восені 2009 года. «Бывайце, Настаўнік», — напішуць дзеля памяці «звяздоўцы». Удзячныя вучні з «Беларускай нівы» прысягнуць, што будуць помніць «Патрыярха беларускай журналістыкі». «Рэспубліканцы» памяць калегі ўшануюць высакародным «Бывайце, Майстар!». Журналісты «Народнай газеты» смуткавалі «Развітанне з Настаўнікам». «У жалобе схіляем галовы...» — пад такім загалоўкам выйшла «Настаўніцкая газета». «СБ. Беларусь сегодня» за подпісам «вучні» абвясціла чытачам пра асірацеласць беларускай журналістыкі з жыццястваральнай перакананасцю «Быў, ёсць, будзе» .

Сацыялагічна-маніторынгавы зрэз дастаткова красамоўна сведчыць пра франтальна ўдзячнае стаўленне выхаванцаў да неардынарнай асобы. Усе, каго зводзілі жыццёвыя пуцявіны з Барысам Васільевічам Стральцовым, памятаюць Настаўніка і пасля заканчэння яго зямнога шляху. Праз сорак дзён «рэспубліканцы» парадавалі чытачоў і вучняў Барыса Васільевіча нататкай «Аўдыторыя імя Мэтра» — пра адкрыццё на факультэце журналістыкі імянной аўдыторыі знакамітага прафесара. «СБ. Беларусь сегодня» ўшанавала сарачыны Настаўніка паведамленнем «Іх імёнамі названы...».

Праз год пасля развітання на ўсю Беларусь у гонар Майстра выйшла-прагучала малітва-рэквіем «Пах месяцовага святла», апублікаваная на старонках «СБ. Беларусь сегодня» Леанідам Екелем. У 2011 годзе «Звязда» звярнулася да аўдыторыі з нататкай «Настаўніку было б 85». Летам 2013 года «СБ. Беларусь сегодня» вобразна, сімвалічна і сімптаматычна напамінае чытачам «У Хутара доўгая памяць» — пра адкрыццё мемарыяльнага барэльефа Б.В. Стральцова на будынку Цэнтральнай раённай бібліятэкі Быхава.

Своеасаблівы агляд друку — тэматычна-персанальны — увачавідкі дэманструе, сведчыць веліч постаці Педагога ад Бога, Даследчыка-энцыклапедыста інфармацыйнай прасторы. Дэманструе сардэчна-духоўныя стасункі вучняў і Настаўніка. Напамінае пра вечную аксіёму. Каб бруіліся празрыстыя крыніцы памяці, вучні здольныя сістэмна трэніраваць сутнасную чалавечую якасць. Не выпадкова і нездарма Майстра ў 2003 годзе на старонках «Рэспублікі» ў класічным абразку «Жывыя крыніцы» па-філасофску заўважыў: «Угледзьцеся ў неба — яго бяздоннасць і бяскрайнасць даюць адчуванне вечнасці. Божухна, якой нікчэмнасцю выглядаюць нашы мітрэнгі і скрухі перад ёю, Вечнасцю».

Заканамерна, што Вечнасць Настаўніка захоўваецца ў скарбонцы памяці яго вучняў. Яна папаўняецца, прырастае з кожным годам, якія аддаляюць нас ад моманту яго сыходу ў

Вечнасць. Але гады не дыстанцыруюць Яго і нас, а наадварот, на адлегласці часу даюць мажлівасць рэльефнага бачання стваральнага працэсу самаадданага служэння Настаўніка журналістыцы Беларусі. Імянная аўдыторыя, барэльеф на быхаўскай бібліятэцы, што на радзіме Настаўніка, штогадовыя першасакавіцкія «Урокі Стральцова» на ўсіх студэнцкіх курсах і патоках журфака жывыць крыніцы ўдзячнай памяці нашчадкаў і дазваляюць асэнсаваць спадчыну Журналіста, Даследчыка, Настаўніка.

Яго школа — школа Майстра. Даследчыцкая спадчына Б.В. Стральцова вельмі багатая і даволі разнастайная па кірунках і праблематыцы. Шматаспектнасць і шматаблічнасць навукова-даследчых інтарэсаў прафесара Б.В. Стральцова абумоўлена яго прафесійным крэда: 1) журналістыка — гэта лад жыцця; 2) журналістыку як прафесію можна асэнсаваць і набыць толькі на штодзённым інфармацыйным канвееры; 3) навучыць журналіста-пачаткоўца кваліфікавана працаваць здольныя толькі журналісты-прафесіяналы; 4) журналістыка — прыкладная навука, яе мэтазгоднасць вымяраецца пошукам новага, эфектыўнага інструментарыя журналіста, абгрунтаваннем функцыянальнай дзеяздольнасці СМІ, распрацоўкай «сотавай сувязі» паміж прадметам пазнання рэчаіснасці, ужывальнымі метадамі аналізу і адлюстравання, формамі творчага звароту да чытача, гледача, слухача.

Асэнсоўваючы гэты інтэграваны падыход-формулу Б.В. Стральцова да адказнай місіі журналіста і даследчыка, педагога і навукоўца, адкрываеш і спасцігаеш яго трапяткую, невычэрпную любоў да прафесіі, яго запаветную і ажыццёўленую мару «журналістам звацца бясконца».

Спрычыненасць да навукова-даследчага азімуту дзеянняў Б.В. Стральцова жыццёва-прафесійнага сталення яго як асобы не выклікае сумненняў. Літаратурны супрацоўнік тагачаснай бабруйскай абласной газеты «Савецкая Радзіма». Літработнік, загадчык аддзела рэдакцыі «Чырвонай змены». Літаратурны супрацоўнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва «Звязды». З 1951 па 1969 год ён валадарыў паміж «молатам» рэдакцыйных заданняў і «кавадлам» творчых памкненняў у журналісцкім цэху і літаратурным апірышчы.

«Агнявы рубеж» — першы журналісцкі матэрыял, змешчаны ў 1948 годзе на старонках вайсковай шматтыражкі «Советская Армия» ў Германіі, сведчыў пра з'яўленне на журналісцкім рубяжы «агнявога» інфармацыйнага прафесіянала. А першая публікацыя на Радзіме, датаваная 1951 годам у бабруйскай абласной газеце, па загалоўку «Вясна ў Рассвеце» наканавала нараджэнне і росквіт будучага спрактыкаванага і аператыўнага інфармацыйшчыка, самабытнага нарысіста, пільнага і іранічнага даследчыка жыцця, мудрага аналітыка.

Здольнасць і схільнасць да аналітычнага ўспрымання свету, вобразнага мыслення і дакладнага адлюстравання рэчаіснасці ў публіцыстычнай манеры спарадзілі кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную тэме, якая і сёння не страціла сваёй запатрабаванасці — «Газета і мараль». Нягледзячы на тагачаснае ідэалагічна-манапольнае гучанне праблемы, вытанчаны даследчык актуалізаваў на многія дзесяцігодзі наперад трыумвірат рэкамендацыйных прапаноў: «маральны выбар — праўда жыцця — баланс інфармацыйнага патоку».

Практыкаарыентаванай стратэгіяй Б.В. Стральцова (тады — у 70—80 гады XX стагоддзя, а сёння яна нарэшце запатрабавана дырэктыўна!) быў прадыктаваны выхад манаграфічных даследаванняў «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Аналітычныя жанры», «Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства»... На іх грунце абаронена доктарская дысертацыя «Праблемы мадыфікацыі функцый і прадмета публіцыстыкі ў газетных жанрах». Гэта дазволіла ўвесці ў вучэбны працэс журфака аж пяць самастойных, але лагічна ўзаемазвязаных і ўзаемаразвіваючых дысцыплін. Яны закладваюць падмурак прафесійнага творчага сталення студэнтаў. Гэтым і тлумачыцца неўміручая памяць выпускнікоў пра Настаўніка.

Натуральна, што пасля паспяховых даследчыцкіх і рацыянальных вучэбна-метадычных учынкаў (змены тыпавога плана навучання ў Савецкім Саюзе — гэта сапраўды мужны стральцоўскі ўчынак!) загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ змог рэалізаваць наступную высакародную задумку — пра стварэнне даследчыцкай школы.

Пільная ўвага Настаўніка да працэсу развіцця здольных студэнтаў, падбор, замацаванне іх у даследчай майстэрні грунтаваліся на светапоглядным прынцыпе — наяўнасць абавязковага практычнага журналісцкага вопыту. Руплівыя захады неўзабаве прынеслі і плён.

Пад кіраўніцтвам прафесара Б.В. Стральцова былі абароненыя шматлікія кандыдацкія дысертацыі. Яны прысвечаныя тыпалогіі і творчым метадам функцыянавання студэнцкай прэсы (Васіль Вараб'ёў), спецыфіцы спартыўнай журналістыкі (Анатоль Мяснікоў), прэса-фарміруючаму фактару аграэканамічнага мыслення асобы (Людміла Белякова), эсэісцкаму адлюстраванню рэчаіснасці (Алена Маськова), сацыяльнай нарысістыцы беларускай перыёдыкі (Сяргей Дубовік), эстэтычным функцыям афармлення выданняў (Аляксандр Свораб), выхаваўчай ролі малых журналісцкіх формаў (Наталля Фядотава)... Дыяпазон тэм і кірункаў даследавання поліфункцыянальнай прыроды журналістыкі аб'ядналі асобай кіраўніка — Б.В. Стральцова. Яго бачанне перспектыў развіцця сродкаў масавай інфармацыі і практыкаарыентаваная мэтазгоднасць навуковага асэнсавання дыктавалі падбор вопытных практыкаў з розных выданняў і фарміраванне беларускай даследчай школы журналістыкі. Пяцёра аспірантаў-замежнікаў, што абаранілі свае навуковыя працы пад крылом Б.В. Стральцова, характарызуюцца гэтай жа даследчай і функцыянальнай адметнасцю.

Напрыканцы XX стагоддзя, у 1997 годзе, прафесар Б.В. Стральцоў даў згоду і ўзначаліў спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый у галіне журналістыкі. Упершыню ў гісторыі журфака з'явілася мажлівасць калектыўнай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Гэтую магчымасць Б.В. Стральцоў бліскуча рэалізаваў на карысць журфака і журналісцкай навукі Беларусі. Чатыры дактары навук і дваццаць адзін кандыдат навук выпеставаныя з лёгкай рукі і з рэдактарска-кансультацыйным удзелам Барыса Васільевіча. Яны і сёння вызначаюць даследчы патэнцыял інфармацыйнай галіны ведаў Беларусі.

Каб быць паходняй, трэба свяціць. Ад дадзенага прынцыпу Барыс Васільевіч не адступаўся ў жыцці ніколі. Гэтым друкаваным зваротам ён заклікаў журналістаў да прафесійнага, кваліфікаванага, творчага ўдасканалення інфармацыйнай прасторы Беларусі. Сваім газетным прыкладам паказваў узоры публіцыстычнага асэнсавання рэчаіснасці, а празаічнымі творамі пракладваў шляхі для дасягнення жаданага майстэрства і маральнага суладдзя з жыццём.

Раман «Між крутых берагоў», зборнікі нарысаў і апавяданняў «Дружная рунь», «Наследнік», «Сходзяцца бальшакі і прасёлкі», «Вячэрняя планета», «Метраном памяці», кніга абразкоў «Капуснік, або Лад жыцця» — гэтыя творы нават сваімі назвамі раскрываюць багаты жыццёвы, журналісцкі і пісьменніцкі шлях Барыса Васільевіча. У сукупнасці яны ўвасабляюць глыбокі сінкрэтычны сэнс поліфанічнага гучання. На беразе маральных альтэрнатыў можна застацца годным і сумленным, звяраючы праўду жыцця з метраномам памяці.

Паходняй на будзень і свята заклікаюць і пераконваюць, упрошваюць і прымушаюць быць ці станавіцца, заставацца ці ўдасканальвацца прарочыя радкі Барыса Васільевіча: «Я перакананы, што над родам чалавечым раскінута разумная субстанцыя, імя якой — Вышэйшая Справядлівасць. І калі ты зрабіў свайму бліжняму, няхай зусім не знаёмаму, нешта добрае, гэта дабром адгукнецца табе, няхай і праз многія гады. Калі ж ты напаскудзіў, паскудства, памножанае на яшчэ большае паскудства, абрынецца на цябе. Іншага не дадзена».

Іншага нам не дадзена: таму што мы — вучні Настаўніка.

Васіль ВАРАБ'ЁЎ.

ПАМЯЦІ НАСТАЎНІКА

У Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сёння праходзіць Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка XXI стагоддзя: традыцыі і выклікі новага часу», прысвечаная 90-годдзю заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара Барыса Стральцова.

Каб падзяліцца сваімі навуковымі і прафесійнымі напрацоўкамі, успомніць Настаўніка і выдатнага журналіста Барыса Стральцова, у сталіцы сабраліся тэарэтыкі і практыкі журналістыкі з розных гарадоў Беларусі, Украіны, Расіі, Славакіі. Адметна і сімвалічна, што арганізатары адмовіліся ад ужо традыцыйнага фармату навуковай канферэнцыі: пасля агульнага пленарнага пасяджэння замест абмеркаванняў у секцыях пройдуць тэматычныя «круглыя сталы». Думаецца, такі падыход абсалютна абгрунтаваны і лагічны: ісціна нараджаецца толькі падчас дыскусіі, прафесійнага абмену думкамі і напрацоўкамі паміж калегамі. Тут усе роўныя, і кожнае меркаванне каштоўнае.

Што да тэматыкі «круглых сталоў», то яна абсалютна сугучная часу. Удзельнікі канферэнцыі абмяркуюць тэндэнцыі развіцця журналісцкіх жанраў, праблемы інтэрнэт-журналістыкі ў прасторы новых медыя, медыятэкст, а таксама камунікатыўныя практыкі новага медыйнага асяродку. Натуральна, асобнае пасяджэнне будзе прысвечана памяці выдатнага журналіста і педагога Барыса Стральцова. Падчас гэтага «круглага стала» яго вучні і калегі падзеляцца сваімі ўспамінамі пра Барыса Васільевіча, распавядуць пра яго ролю ў прафесійным станаўленні, прааналізуюць тая рысы асобы, што сталі вызначальнымі ў лёсе выдатнага творцы.

Годовой отчет
ОАО «Гомельжилпроект»

Полное наименование: Открытое акционерное общество «Гомельжилпроект»
Адрес: 246050, г. Гомель, ул. Кирова, 17, т/ф 8 (0232) 71-04-30
Полное ф.и.о. руководителя: Врублевский Виталий Валентинович
Полное ф.и.о. гл. бухгалтера: Прохоренко Евгения Сергеевна
Единица измерения: млн. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2015 года	На 31 декабря 2014 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	3 171	3 404
Нематериальные активы	120	1	1
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	488	488
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**3 660**	**3 893**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 023	887
в том числе: материалы	211	282	382
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	715	505
готовая продукция и товары	214	26	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	63	3
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	4 630	3 254
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	909	572
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**6 625**	**4 716**
БАЛАНС	**300**	**10 285**	**8 609**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2015 года	На 31 декабря 2014 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	6 123	6 123
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	808	808
Добавочный капитал	450	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	361	331
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**7 292**	**7 262**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2 993	1 347
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	113	170
по авансам полученным	632	2 034	378
по налогам и сборам	633	241	359
по социальному страхованию и обеспечению	634	80	68
по оплате труда	635	501	332
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	3	3
прочим кредиторам	638	21	37
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
